Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

КРАСАВІК 8 НЯДЗЕЛЯ 1934 г. № 76 (4909) Год выдання XVII

Пролетарыі усіх краін, злучайцеся

ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО

ТРЭЦІ РАЁННЫ ЗЛЁТ КАЛГАСНІКАЎ - УДАРНІКАЎ ЧЫРВОНАПОЛЬШЧЫНЫ Ў ЛІКУ 600 ЧАЛАВЕК ШЛЕ ТАБЕ ГАРАЧАЕ БОЛЬШЭВІЦКАЕ КАЛГАСНАЕ ПРЫВІТАННЕ. ЗАПЭЎНЯЕМ, ШТО СЯЎБУ ГЭТАГА ГОДА ПРАВЯДЗЕМ У ВЫЗНАЧАНЫ ПАРТЫЯЙ І ЎРАДАМ ТЭРМІН. У ГЭТЫМ ГОДЗЕ БУДЗЕМ ТРЫМАЦЬ БАЯВЫ ЭКЗАМЕН ПА ПАВЫШЭННЮ ЎРАДЖАЮ, ПА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЮ ЛОЗУНГА ТАВ. СТАЛІНА — ЗРАБІЦЬ КАЛГАСЫ БОЛЬШЭВІЦКІМІ, КАЛГАСНІКАЎ ЗАМОЖНЫМІ. У СПАБОРНІЦТВЕ З ПРАПОРСКІМ РАЁНАМ МЫ ЗМОЖАМ ВЫВЕСЦІ НАШ РАЁН У ПЕРАДАВЫЯ РАЁНЫ БССР.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ПЕРШЫ КАЛГАСНЫ ЎДАРНІК ТАВ. СТАЛІН!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЦК ПАРТЫІ НА ЧАЛЕ З ТАБОЮ ТАВ. ГІКАЛО!

ПРЭЗІДЫУМ ЗЛЁТУ.

ПЯЦЬ ЧЭЛЮСКІНЦАЎ ДАСТАЎЛЕНЫ У ВАНКАРЭМ

ГЕРАІЧНЫ ПЕРАЛЁТ КАМАНІНА І МОЛАКАВА

ВАНКАРЭМ, 7 КРАСАВІКА. (БЕЛТА).

АВАРЫЙНАЯ, УРАДАВАЯ.

МАСКВА. СОЎНАРКОМ—КУЙБЫШЭВУ. КОПІЯ «ГЛАВСЕВМОРПУТЬ» — ІОФФЕ.

7 КРАСАВІКА КАМАНІН, МОЛАКАЎ І СЛЕПНЁЎ ПРЫЛЯЦЕЛІ Ў ВАНКАРЭМ. У ТОЙ-ЖА ДЗЕНЬ ВЫЛЕЦЕЛІ Ў ЛАГЕР ШМІДТА.

САМАЛЁТ СЛЕПНЁВА ПРЫ ПАСАДЦЫ ПАШКОДЗІЎ ШАСІ—ЛОПНУЛА ПРАВАЯ СЦЯЖКА. МЯРКУЮЦЬ СЕННЯ АДНАВІЦЬ, А ЗАЎТРА ЛЯЦЕЦЬ З ЛАГЕРА З ПАСАЖЫРАМІ Ў ВАНКАРЭМ.

САМАЛЁТЫ КАМАНІНА І МОЛАКАВА ЗРАБІЛІ АДЗІН РЭЙС. ДАСТАВІЛІ ДВУМА САМАЛЁТАМІ 6 ПАСАЖЫРАЎ.

ПРЫ НАЯЎНАСЦІ ЛЕТНАЙ ПАГОДЫ 8-ГА САМАЛЁТЫ ВЫЛЯТАЮЦЬ У ЛАГЕР. МЕСЦА ЛАГЕРА 7 КРАСАВІКА: ШЫРЫНЯ 68 ГРАДУСАЎ 20 МІН., ДАЎЖЫНЯ 173 ГРАД. 04 МІН. ЗАХ. ДАЎЖЫНІ.

ПЕТРОЎ.

Пленум масавай баявой арганізацыі

Заўтра адкрываецца IV пленум ЦС Асоавіяхіма БССР з шырокім удзелам ударнікаў абарончай работы.

Работа пленума і далейшыя задачы асоавіяхімаўскай арганізацыі адлюстроўваюцца сучаснай міжнароднай абстаноўкай, ахарактарызаванай тав. СТАЛІНЫМ на XVII партз'ездзе, як абстаноўка вострых супярэчнасцей паміж імперыялістычнымі дзяржавамі і нарастаючай пагрозы нападу на Совецкі Саюз.

Няўхільна захоўваючы і праводзячы палітыку міру, наша партыя і ўрад робяць усё неабходнае для ўзмацнення абароназдольнасці краіны, каб не аказацца захопленымі знянацку. Поспехі індустрыялізацыі краіны стварылі спрыяючыя ўмовы для аснашчэння рабоча-сялянскай Чырвонай арміі навейшымі тэхнічнымі сродкамі абароны. Наша армія эараз моцная як ніколі. Не сіла не толькі ў тэхнічным узбраенні, а ў яе класавым інтэрнацыянальным характары, у яе самаадданасці і гатоўнасці змагацца, не шкадуючы ні сваіх сіл, ні самога жыцця, за справу сацыялізма. Яе невычарпальныя рэзервы — у шматмільённых працоўных масах, для якіх абарона краіны сацыялістычнага будаўніцтва з'яўляецца кроўным, свяшчэнным абавязкам.

Адным з важнейшых паказальнікаў актыўнасці працоўных мас у барацьбе за ўмацаванне абароназдольнасці краіны з'яўляецца рост арганізацыі Асоавіяхіма. Праз гэту арганізацыю, не адрываючыся ад вытворчасці, тысячы працоўных навучаюцца майстэрству меткай стральбы і лётнай справы. Сотні стралковых гурткоў, 600 ціраў, 2 аэраклубы, 2 планерныя станцыі, 27 планерных і 61 авіямадэльных гурткоў — такія паказальнікі арганізацыйнай работы таварыства Асоавіяхіма БССР.

За апошнія гады Асоавіяхім даў 8.200 «варашылаўскіх стралкоў». Вялікую ініцыятыву і актыўнасць у гэтай рабоце праяўляе комсамольская арганізацыя Беларусі. Рыхтуючы «варашылаўскіх стралкоў», лётнікаў, планерыстаў, абучаючы працоўных вайсковай справе на аснове добраахвотнасці, асоавіяхімаўская арганізацыя выконвае важнейшыя ўказанні Уладзіміра Ільіча ЛЕНІНА аб тым, каб кожны рабочы ўмеў добра страляць і валодаць самой зброяй.

Ролю асоавіяхімаўскай арганізацыі ў сістэме ўсёй работы па ўзмацненню абароназдольнасці краіны сацыялістычнага будаўніцтва добра разумее класавы вораг. Кулацкія, антысавецкія, нацыяналістычныя элементы імкнуцца праз яе ў гэтую арганізацыю з пэўнай варожай мэтай. Таму класавая пільнасць тут павінна быць асабліва высокай.

Год таму назад ЦК КП(б)Б на чале з тав. ГІКАЛО прыняў рад практычных мер для ўмацавання кіруючых звенняў Асоавіяхіма БССР. Ачышчая ад чужых элементаў і ўмацоўваючы большэвіцкімі кадрамі апарат Цэнтральнага Совета, у значнай меры ўмацаваны раённыя кіруючыя звенні Асоавіяхіма. На аснове ўказанняў ЦК КП(б)Б аб перабудове работы Асоавіяхіма, галоўная ўвага сканцэнтравана на заводах, саўгасах, МТС і калгасах, як рашаючых звеннях абарончай работы.

Па ініцыятыве перадавых прадпрыемстваў праводзіцца варашылаўская абарончая эстафета. Рэзультаты гэтай работы велізарныя. За час эстафеты асоавіяхімаўская арганізацыя вырасла на 80 тысяч новых членаў і 7 тысяч «варашылаўскіх стралкоў». Па будавана 346 стралковых ціраў. Толькі па 27 раёнах 40 тысяч чалавек аўладалі неабходнымі ведамі процівагазнай абароны (СПА). Па пастаноўцы абарончай работы заслугоўваюць быць адзначанымі як перадавікі асоавіяхімаўская арганізацыя завода імя Варашылава (Менск), Добрушскай фабрыкі (Гомель) і Аршанцічыны, асабліва калгасаў «Чырвоны бераг», «Парычская комуна» і «Чырвоны ўсход». Гэтыя арганізацыі сваёй работай паказваюць узоры большэвіцкай барацьбы за ператварэнне свайго завода, фабрыкі, саўгаса, калгаса ў «крэпасць абароны».

Аднак, у радзе месц работа Асоавіяхіма яшчэ на вельмі нізкім узроўні. Некаторыя партыйныя арганізацыі зусім недастатково ўвагі аддаюць гэтай рабоце. У Лепельскім, Шклоўскім, Парыцкім, Чэрыкаўскім, Кармянскім і Магілеўскім раёнах зусім не адчуваецца ячэек Асоавіяхіма. За агульнымі разважаннямі наконт абарончай работы практычна нічога не праводзіцца. У Шклове на працягу цэлага года амаль штодзённа перасоўвалі навучальны пункт з аднаго ў другое памяшканне, а заняткаў так і не арганізавалі. У Лепелі раённыя кіраўнікі «ўмудрыліся» адабраць ад райсавета Асоавіяхіма памяшканне і перадаць яго пад склад Заготзярно, а старшыню райсавета т. Каратыша пазбавілі магчымасці аддаць колькі-небудзь часу абарончай рабоце.

Падобных фактаў недаацэнкі абарончай работы, пагардлівых адносін да яе і простага галавацяпства нямала. Па такіх фактах трэба біць з усёй сілай. Справа гонару кожнай партыйнай арганізацыі ўсямерна садзейнічаць і ўзмацняць работу ячэек Асоавіяхіма, забяспечваючы выкананне пастаўленых XVII з'ездам партыі задач узмацнення абароназдольнасці краіны.

Пленум ЦС Асоавіяхіма метадам большэвіцкай самакрытыкі ўскрые недахопы работы і ў адпаведнасці з пастаўленымі XVII з'ездам партыі задачамі арганізацыйнай перабудовы партыйнай і совецкай работы, дасць канкрэтныя ўказанні па перабудове работы таварыства Асоавіяхіма.

Каб зрабіць ячэйкі Асоавіяхіма больш ініцыятыўнымі і боездольнымі, неабходна павысіць рэвалюцыйную пільнасць, выпхаць з іх радоў чужакоў, непаправімых балбатуноў, бюракратаў і чыноўнікаў, засядаючых яшчэ сям-там у кіруючых органах Асоавіяхіма. Абарончая работа на лініі Асоавіяхіма павінна заняць сваё пачэснае месца на кожным прадпрыемстве, саўгасе, МТС і калгасе. Кожны ўдарнік на вытворчасці павінен стаць ударнікам абароны.

Цэнтр цяжару работы па ваенізацыі павінен канцэнтравацца ў нізавых вытворчых звеннях. Кожнаму цэху — стражовы гурток, гурток сувязі і СПА, вайсковы гурток і цір!

У МТС, саўгасах і калгасах апрача стралковых і вайскова-тэхнічных гурткоў неабходна арганізаваць вайскова-хімічныя атрады па барацьбе са шкоднікамі ў сельскай гаспадарцы. Там трэба мець ваенізаваныя канюшні, гурткі службовага сабакаводства, галубаводства і фізкультурныя гарадкі.

Прымежнае становішча БССР асабліва абавязвае нас пастаноўцы ўзорнай баявой работы па ўзмацненню абароназдольнасці СССР.

ДУБІНА.

АБ ПРАКТЫЧНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА АСВАЕННЮ НОВЫХ ЗЯМЕЛЬ

Пастанова ЦК КП(б)Б

Зацверджаны ЦК ВКП(б) план аб асваенні ў 1934 годзе 115.000 га новых зямель і зацверджаны ЦК КП(б)Б план па раёнах з'яўляецца выключна буйным гаспадарчым і палітычным мерапрыемствам, забяспечваючым увядзенне севазвароту, рост пасеўных плошчаў пшаніцы, павелічэнне кармовых рэсурсаў, рост ураджайнасці ў сувязі з павелічэннем папару.

Выкананне гэтага плана па асваенню новых зямель тым больш важна, што практыка давядзення плана веснавой сяўбы на 1934 г. паказала з усёй відавочнасцю, што большасць раёнаў замест большэвіцкай барацьбы за асваенне новых зямель займалася разважаннямі аб далейшым скарачэнні пасеўных плошчаў.

Не гледзячы на выключную важнасць гэтага мерапрыемства, раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі і ў асаблівасці зямельныя органы (райза, МТС, соўгасы) не аддавалі дастатковай увагі гэтаму пытанню. У рэзультаце гэтага план асваення новых зямель большасцю раёнаў у 1933 годзе сарваны: замест 66.000 га, зацверджаных планам ЦК, асвоена толькі 16.000 га.

У мэтах поўнага выканання плана асваення новых зямель у 1934 годзе ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Абавязаць усе райкомы, РВК, загадчыкаў райземаддзелаў, дырэктароў і начальнікаў палітаддзелаў МТС і соўгасаў не пазней 15 красавіка г. г. распрацаваць і давесці да калгасаў, соўгасаў і сельсоветаў (па аднаасобнаму сектару) план распашак і асваення новых зямель і разам з планам распрацаваць і давесці арганізацыйныя мерапрыемствы па выкананню плана. Адзін экземпляр плана з разбіўкай па калгасах МТС і не МТС і сельсоветах і намечаныя арганізацыйныя мерапрыемствы прыслаць у НКЗ БССР не пазней 20 красавіка г. г.

Планам прадугледзець, каб не менш 80 проц. задання па асваенню новых зямель было выканана да 1 жніўня і 20 проц.—да 1 кастрычніка г. г.

Абавязаць праўленні калгасаў неадкладна пасля сканчэння веснавой сяўбы разбіць участкі нова-асвойваемых зямель паміж калгаснымі брыгадамі, вылучыўшы для работ па асваенню новых зямель лепшых коняй, і забяспечыць гэтыя брыгады неабходным сельска-гаспадарчым інвентаром і інструментамі.

Прэзідыумы сельсоветаў, пад асабістую адказнасць старшынь, абавязаны давесці планы новых распашак да кожнага аднаасобнага двара, забяспечыўшы неабходную дапамогу і кіраўніцтва справай распашак.

Абавязаць рэвізійныя камісіі калгасаў праверыць не пазней 1-га чэрвеня г. г. выкананне па калгасах данай дырэктывы і ходу распашак з прыцягненнем да адказнасці асоб, зрываючых справу распашак.

Даручыць СНК праверыць не пазней 15 чэрвеня ў радзе раёнаў работу па правядзенню новых распашак з тым, каб у выпадку неабходнасці даць дадатковыя ўказанні і прыняць меры супроць асоб, зрываючых або тармозячых своечасовае выкананне плана па новых распашках зямлі.

Белсельгасснабу забяспечыць завоз неабходных сельскагаспадарчых машын і прылад для асваення новых зямель і прадставіць на разгляд СНК не пазней 10 красавіка падрабязны план намечаных мерапрыемстваў.

Абавязаць сельска-гаспадарчы аддзел ЦК і Наркамзем устанавіць сістэматычную праверку выканання гэтага рашэння кожным раёнам у паасобку.

Аб арганізацыйных мерапрыемствах у галіне совецкага і гаспадарчага будаўніцтва

Пастанова ЦВК і СНК БССР

У адпаведнасці з пастановай ЦВК і СНК Саюза ССР за 15 сакавіка 1934 года «Аб арганізацыйных мерапрыемствах у галіне совецкага і гаспадарчага будаўніцтва» (газета «Известия ЦИК и ВЦИК» № 64 за 16-III—1934 г.), Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Ліквідаваць ва ўсіх совецкіх і гаспадарчых органах функцыянальную сістэму пабудовы апарата і перабудаваць іх, пачынаючы ад нізавых вытворчых звенняў да народных камісарыятаў уключна, на вытворча-тэрытарыяльнай аснове, арганізаваўшы ў народных камісарыятах і кіраўніцтвах галоўныя вытворчыя, або вытворча-тэрытарыяльныя кіраўніцтвы, якія нясуць адказнасць і маюць права па ўсіх пытаннях кіраўніцтва падпарадкаванымі ім арганізацыямі і ўстановамі, і абмежаваўшы ў правах пакідаемыя функцыянальныя органы з забаронай ім умешвацца ў работу нізавых звенняў праз галаву галоўных кіраўніцтваў.

2. Ліквідаваць у гаспадарчым апараце аб'яднанні. Скараціць колькасць трэстаў і пашырыць непасрэдную сувязь цэнтральных гаспадарчых органаў, народных камісарыятаў і кіраўніцтваў з буйнейшымі падпарадкаванымі ім прадпрыемствамі.

3. Ускласці на кіраўнікоў усіх совецкіх і гаспадарчых органаў абавязак асабіста ажыццяўляць штодзённую праверку выканання падпарадкаванымі ім органамі рашэнняў і распараджэнняў вышэйстаячых органаў, з забаронай перакладваць справу праверкі выканання на другарадныя дапаможныя органы, і ліквідаваць ва ўсіх звеннях совецка-гаспадарчага апарата спецыяльныя сектары праверкі выканання.

4. Ускласці на кіраўнікоў усіх совецкіх і гаспадарчых органаў абавязак асабістага кіраўніцтва падборам і размеркаваннем гаспадарчых і інжынерна-тэхнічных работнікаў з перасоўваннем пры гэтым значнай часткі інжынерна-тэхнічных кадраў з канцылярыі на вытворчасць ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі і дзяржаўнага кіраўніцтва.

5. Абавязаць кіраўнікоў усіх совецкіх і гаспадарчых органаў скараціць дачу рознага роду загадаў і распараджэнняў і ўзмацніць штодзённае жывое кіраўніцтва, інструктаванне, навучанне і практычную дапамогу кіраўнікам нізавых органаў совецка-гаспадарчага апарата.

6. Абавязаць кіраўнікоў гаспадарчых органаў і прадпрыемстваў аўладаць асновамі тэхнікі сваёй справы, для чаго распрацаваць па кожнай галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі і іншых галінах народнай гаспадаркі тэхнічны мінімум, які належыць абавязковаму вывучэнню ў поўны мінімальны тэрмін усімі кіруючымі працаўнікамі.

7. Ліквідаваць калегіі ва ўсіх галінах совецка-гаспадарчай работы, за выключэннем выбарных совецкіх органаў (советы, выканаўчыя камітэты), пакінуўшы на чале народнага камісарыята — народнага камісара і не больш двух намеснікаў.

8. Стварыць пры народных камісарыятах склікаемыя раз у два месяцы советы народных камісарыятаў ад 40 да 70 чалавек у кожным, забяспечыўшы ў іх складзе не менш палевы прадстаўнікоў асобных арганізацый і прадпрыемстваў.

Совету Народных Камісараў БССР устанавіць колькасць і склад гэтых советаў па кожнаму наркамату.

9. Узмацніць масавы кантроль над работай органаў кіравання і забяспечыць усямернае ўцягванне мас у справу барацьбы з бюракратычнымі язвамі і недахопамі дзяржаўнага апарата.

Пашырыць сетку секцый советаў і дэпутацкіх груп на прадпрыемствах, у вёсках, а ў вялікіх гарадах арганізаваць падраённыя ўчастковыя групы дэпутатаў советаў, асабліва ўцягваючы ў гэту работу жанчын-актывістак, работніц і калгасніц.

10. Перадаць прафесіянальным саюзам кантрольныя правы на прадпрыемствах і кіраванне кантрольнымі органамі пры аддзелах рабочага снабжэння, закрытых рабочых кооператывах, раённых спажывецкіх таварыствах і гарадскіх спажывецкіх таварыствах, а таксама разгрузіць шэфства прадпрыемстваў і дзяржаўнымі ўстановамі і соцыялістычнае сумяшчэнне работы на ім з творчасцю з работай у дзяржаўных установах.

11. У адпаведнасці з выпажаным вышэй асновамі перабудовы совецка-гаспадарчых органаў:

а) абавязаць народных камісараў на працягу дэкады ліквідаваць калегіі і падаць на зацвярджэнне ЦВК БССР намеснікаў народных камісараў;

б) абавязаць народных камісараў і кіраўнікоў цэнтральных устаноў у працягу месяца распрацаваць на іх казаных вышэй асновах і падаць у СНК БССР папажэнне і структуру народных камісарыятаў і цэнтральных устаноў;

в) абавязаць народных камісараў асабіста кіраваць распрацоўкай тэхнічнага мінімуму, які належыць авладаць вязковаму вывучэнню кіруючымі працаўнікамі кожнай галіны, і у працягу месяца падаць у СНК БССР першую справаздачу аб праробленым у сувязі з гэтым народнымі камісарыятамі рабоце.

12. Забяспечыць на працягу 1934 года скарачэнне штатаў усіх совецкіх і гаспадарчых органаў не менш чым на 10-15 проц. у параўнанні са штатамі, вызначанымі для іх у 1933 годзе, а таксама рэзка скараціць існуючыя формы ўчота і справаздачнасці зверху да нізу.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЯЎКОЎ

ПОЎНЫМ ХОДАМ РАЗГАРНУЦЬ МАСАВАЕ ВОРЫВА

НЕ АДКЛАДВАЮЧЫ НІ НА АДНУ ГАДЗІНУ, ПАДРЫХТАВАЦЬ ГЛЕБУ ПАД ПАСЕЎ АЎСА І ІЛЬНУ

АПОШНІЯ ВЕСТКІ З ПАЛЁЎ

Талачын

Перадавая паляводчая брыгада Зелюткіна калгаса «Ударнік», Няхлюдаўскага сельсовета, разгарнула социялістычнае спаборніцтва на выкарыстанне ўсякіх рэсурсаў для ўгнаення палёў. Вылучаны 2 чалавекі, якія адказваюць за дадатковую вывазку гною. Прыкладу брыгады Зелюткіна паследавалі 25 брыгадзіраў іншых калгасаў. Брыгадзір Цыркуноў (калгас «Васількі»), вылучыўшы двух адказных за гэту справу калгаснікаў, дабіўся таго, што дадаткова вывезена на поле 150 вазоў добрага гною. Збіраецца гной з вуліц, двароў калгаснікаў. Брыгада Шэмпеля, гэтага-ж, калгаса, вывезла дадаткова 200 вазоў гною.

Аднаасобнікі вёскі Маляўкі, Слаўнаўскага сельсовета, скончылі веснавое ворыва на плошчы ў 60 гектараў. Распачата баранаванне, падрыхтоўка глебы пад раннюю сяўбу. Аднаасобнікі звярнуліся з адозвай да ўсіх аднаасобнікаў раёна, у якой заклікаюць на аснове разгортвання спаборніцтва паміж дзесяцідворкамі скончыць сяўбу за 15 дзён.

Барысаў

У калгасе «Новае жыццё», Адзяніцкага сельсовета, узарана 15 гектараў і забаранавана 12. Узорныя прыклады работы паказвае першая брыгада, на чале якой стаіць старэйшы брыгадзір тав. Брыль. Брыгада штодзённа перавыконвае заданне. Узораная глеба залічваецца ў калгасе толькі тады, калі яе прымае брыгадзір і старшыня калгаса. Выпадкаў дрэннай якасці работы не было.

Ушачы

У калгасе імя Сталіна, Глыбачанскага сельсовета, дбайна падгатаўляюць зямлю да сяўбы. Узараны 54 гектары.

Усе работы праходзяць пад знакам заваявання першынства ва ўсе беларускім і ўсесаюзным спаборніцтве брыгад. У перадзе ідзе брыгада № 2 Седунова Міколы, які разгарнуў спаборніцтва звенняў. Брыгада штодзённа перавыконвае нормы па ворыву і баранаванню на 20-30 проц. пры высокай якасці работ.

КОЖНАЙ БРЫГАДЗЕ—РАБОЧЫ ПЛАН

Брыгадзіры Магілёўскай МТС не ведаюць, дзе ім сеяць

Зараз, калі ў радзе раёнаў пачаліся палявыя работы, а да масавай сяўбы засталіся лічаныя дні, рашаючай умовай паспяховага правядзення сяўбы з'яўляецца правільная расстаноўка сіл, арганізацыя працы, планаванне яе ў брыгадах.

Між тым у радзе калгасаў Магілеўшчыны гэты ўчастак — самы закінуты.

У перадавых калгасах зоны МТС імя Карла Маркса, «Шлях комунізма» і рад іншых — не дрэнныя коні, адрамантован інвентар, адсартавана насенне, створаны брыгады. Як быццам-бы ўсё ў парадку. Аднак, гэта далёка не так.

Калгас імя Карла Маркса. 500 га яравога кліну, 3 палявыя брыгады, у гэтым годзе быў прыліў на 16 гаспадарак. І вось у гэтым калгасе ні адзін брыгадзір не ведае, дзе і што ён будзе сеяць. Севазвароту няма. Не вызначаны ні палі, ні ўчасткі, абязлічана насенне.

— Праз дзень-два, — кажуць брыгадзіры, — на поле трэба выязджаць, а мы не ведаем, куды ехаць і што дзе сеяць.

Прычыны такога становішча ў тым, што заг. райземаддзела т. Мікееў не лічыць патрэбным займацца гэтай справай, што землеўпарадчык паехаў у Маскву.

Старшыня калгаса Таборка, запраектаваў на 1934 г. ураджайнасць меншую, чым у мінулым годзе амаль па 10-20 проц.

Ушчыльненне працоўнага дня—адна з рашаючых прадпасылак правядзення сяўбы ў найкарацейшыя тэрміны. Трэба, каб ужо зараз кожны брыгадзір меў дэтальна распрацаваны рабочы план. На справе-ж гэтага няма. У многіх калгасах зоны дзейнасці МТС брыгадзіры нават не маюць уяўлення аб такім плане. І гэта не дзіўна. Аграном МТС Іванаў таксама не разумее сутнасці ўнутры-брыгаднага планавання.

— Мы гэтым не займаліся...

Трэба сказаць, што нават пры распрацоўцы гадавых вытворчых планаў дапускаюцца грубыя памылкі.

Калгас «Шлях да комунізма». Старшынёй тут ударніца Бачанкова Поля. І вось у гэтым калгасе пры ўдзеле агранома Коташава на агульным сходзе зацвярджаецца план. Калі справа даходзіць да вызначэння ўраджайнасці, аграном прапануе:

— Трэба ўлічыць магчымасці кожнай брыгады ў паасобку.

Правільна. Але... на сходзе няма ніводнага брыгадзіра. Яны на курсах і прыедуць толькі 10 красавіка.

Перакідваць да наступнага пункта:

— Сяўбу зернавых правесці ў 10 дзён. Некаторыя калгаснікі супярэчаць:

— Не справімся...

І замест таго, каб з алоўкам у руках давесці калгаснікам рэальнасць плана, аграном Коташаў «пераконвае» калгаснікаў так:

— Такі тэрмін райвыканкомам вызначан...

Ясна, што такі адказ нікога не задаволіў.

Не лепш планавалася ўраджайнасць:

— Ячменю з га 12 цэнтн...

— Навошта пісаць. А калі не ўродзіць?... — раздаецца голас.

Аграном адказвае на гэта вельмі «проста»:

— Гэта трэба для плана... Задачу трэба паставіць... А што ўродзіць, ніхто ведаць не можа...

Некалькі слоў аб інспекцыях якасці. Яны вылучаны. Але ўсюды яшчэ не працуюць, чакаюць сяўбы, каб складаць акты. А якасць насення, рамонта, коняй, кармоў іх не цікавіць. Аб гэтым ім ніхто нічога не гаварыў. Між тым, як ужо сама падрыхтоўка ў значнай ступені вырашае якасць работ па сяўбе.

Памылак і недаробак шмат. Яны павінны быць неадкладна выпраўлены.

В. ДАЛЬ.

Магілеў.

УЗАРАНА 3.440 ГЕКТАРАЎ

СЕННО.

Пагода спрыяе разгортванню масавых палявых работ. На 5 красавіка ў раёне ўзарана 3.440 гектараў, што складае 21 проц. веснавога ворыва.

Асаблівая ўвага аддаецца ворыву пад лён. Райком партыі і райвыканком далі ўказанні ўсім сельсоветам і калгасам пераключыць большую частку цягавай сілы на падрыхтоўку ўчасткаў, вызначаных пад лён. У калгасе «Новы луч» пад лён падрыхтавана ўжо 14 гектараў. У калгасе «Вольная праца» — 22 гектары. (БЕЛТА).



6 красавіка ў соўгасе «Блонь», Пухавіцкага раёна, пачалося рыва. НА ЗДЫМКУ—трактарыст Грыхуціч на рабоце.

АНЕКДАТЫЧНАЯ СПРЭЧКА АБ АДНААСОБНІКУ

(Ад беларускага карэспандэнта «Праўды»)

Нядаўна на пасяджэнні бюро гомельскага гаркома адбылася анекдатычная спрэчка: усё бюро горача абмяркоўвала пытанне аб тым, ці лічыць аднаасобніка забытым ці толькі недастаткова падрыхтаваным да сяўбы. Па прапанове сакратара гаркома Шафарэнка бюро пастанавіла «лічыць аднаасобнікаў недастаткова падрыхтаванымі да сяўбы».

Гэтыя «тонкасці» ў фармулёўках не мяняюць, аднак, становішча справы. У Магілеўскім раёне пасевы аднаасобнікаў забяспечаны насеннем толькі на 40 проц. Вялікае хаджэнне ў раёнах, у тым ліку і ў Гомельскім, мае кулацкая «тэорыйка» аб тым, што сярод аднаасобнікаў не трэба праводзіць работу, бо яны самі справяцца з сяўбой.

Па ўсёй Беларусі, дзе сяўба пачалася ўжо, пасеўныя заданні яшчэ не даведзены да аднаасобных гаспадарак. Наркамзем Беларусі аднёсся да гэтай справы выключна фармальна. Планавік Наркамзема сарчык паведаміў, што ўсё зроблена: «Планы сяўбы спушчаны ўнёнам». Планы сапраўды разасланы, але няма кантролю над тым, як раёны даводзяць іх да аднаасобных гаспадарак.

Наркамзем не ведае, ці забяспечаны аднаасобныя гаспадаркі насеннем. Страхавыя фонды не засыпаны. Асабліва востра стаіць пытанне з цягай. Пад уплывам кулацкай агітацыі ў радзе раёнаў жывёла знішчаецца. У 108 аднаасобных гаспадарках Касцюшкаўскага сельсавета, Крычаўскага раёна, астаўся толькі 12 коняй.

У Беларусі—41 проц. аднаасобных гаспадарак. Пасеўная плошча аднаасобнікаў роўна 37 проц. агульнага яравога кліну. Тым больш зразумела, чаму Наркамзем Беларусі заняў пазіцыю неўмяшання ў падрыхтоўку аднаасобнага сектара да сяўбы.

(«ПРАВДА»).

Усім рэдактарам цэнтральных, раённых, транспартных і фабрычна-заводскіх газет

У сувязі з разгарнуўшайся сяўбой усебеларуская нарада рэдактароў АДКЛАДВАЕЦЦА.

Загадчык аддзела культуры і пропаганды ленінізма ЦК КП(б)Б КОНІК.

БАБРУЙСКАЯ КУСТАВАЯ НАРАДА ПА ПЕРАБУДОВЕ ПАРТРАБОТЫ

Лепшыя ўзоры перабудовы бабруйскай партарганізацыі зрабіць здабыткам усёй КП(б)Б

31 САКАВІКА Ў Г. БАБРУЙСКУ АДБЫЛАСЯ СКЛІКАНАЯ ЦК КП(б)Б КУСТАВАЯ НАРАДА БАБРУЙСКАГА, АСІПАВІЦКАГА, ПАРЫЦКАГА, ГЛУСКАГА, КАРМЯНСКАГА І ЖЛОБІНСКАГА РАЁНАЎ, ПРЫСВЕЧАНАЯ ПЕРАБУДОВЕ ПАРТРАБОТЫ.

НА НАРАДЗЕ З ІНФАРМАЦЫЯМІ З МЕСЦ ВЫСТУПАЛІ НАМЕСНІКІ САКРАТАРОЎ, ІНСТРУКТАРЫ РАЙКОМАЎ, САКРАТАРЫ ПАРТКОМАЎ, ЦЭХАВЫЯ І ЗВЕННЕВЫЯ ПАРТАРГАНІЗАТАРЫ І ПРАПАГАНДЫСТЫ.

СЁННЯ МЫ ПАКАЗВАЕМ ПЕРШЫ ВОПЫТ ПЕРАБУДОВЫ РАБОТЫ БАБРУЙСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ.

МІЛЕР (*Сакратар бабруйскага райкома партыі*)

ЛІКВІДАВАЛІ ЗАСЯДАЦЕЛЬСКУЮ МІТУСНЮ

Усяго ў Бабруйскім раёне 47 прадпрыемстваў. Лесакамбінат, які ня толькі вялікае значэнне для Бабруйшчыны, але і для ўсёй Беларусі, раскідан на 10 кв. кілометраў. Склад рабочых надзвычай складны. Пролетарская праслойка значная. Многа былых саматужнікаў. Усё гэта прадстаўляе труднасці як у сэнсе выхавання мас, так і ў сэнсе партыйнай работы. Больш кампактная маса на фарфорным заводзе № 16 і на швейнай фабрыцы. На камбінаце і швейнай фабрыцы па-рознаму пастаўлена арганізацыйная работа. Гэта тлумачыцца тым, што мы вельмі дарожна падыйшлі да перабудовы.

Камісія па чыстцы адзначыла палітычную няграматнасць партыйнага камбіната. А гэта-ж на сутнасці вядучая арганізацыя. Такая ацэнка вядучай арганізацыі ў асноўным характарызуе ўсе астатнія арганізацыі.

Наша вясковая партарганізацыя сёння нязначная, усяго 173 комуністы. Сельская гаспадарка калектывізавана ў нас на 35 проц. У чкоўскім сельсавеце калгасы складаюцца з 12-15 гаспадарак. У нашым большым калгасе — 43 гаспадаркі. Дробныя калгасы — гэта рэзультат слабай партыйнай работы.

Слабасць партыйна-масавай работы стварае глебу для работы класавага ворага. А класавы вораг працуе ў Бабруйскім раёне актыўна. Аб гэтым сведчыць засмечанасць калгасаў, якую мы ўжо выявілі і выкрылі, але яшчэ недастаткова. Аб гэтым таксама сведчыць знішчэнне коней, маладняка.

Адсюль асабліва важнае і рашаючае значэнне мае ўмацаванне і правільная пастаноўка партыйна-масавай работы, своечасовая і правільная перабудова ўсёй работы, асабліва на вёсны, як найбольш слабым участку.

У асноўным нашы зоны інструкторскай дзейнасці размеркаваны так, што маюць ужо сваю спецыялізацыю.

Напрыклад, малочна-бульбяныя — Любоіцкі, Рымавецкі сельсоветы; насенняводча-гародняя — Валеўскі сельсавет і т. д. Мы ўлічвалі таксама і выгады сувязі. Такім чынам мы размеркавалі раён на участкаў, прычым выходзілі і з географічных меркаванняў. Атрымалася так, што ў нас ад трох да пяці сельсаветаў уваходзіць у зону дзейнасці інструктара, а ў трох гадах у нас па пяць сельсаветаў, і далі туды больш моцнага інструктара, на 5 сельсаветаў па адному інструктару.

З інструктарамі мы яшчэ слабавацуем. У нас работа праходзіць так. Адзін раз у дэкаду абдываецца засяданне бюро, і яны прыязджаюць на гэта пасяджэнне. Тав. Шутаў — нам. сакратара райкома правёў з імі дзве нарады. Апошняя нарада дала крыху больш вопыту. Стаялі два пытанні: вынікі перабудовы на сутнасці і пытанні росту работы. Таксама былі паслуханы два даклады агранома — звышпланавый і ранняй сяўбе.

Другое, неабходнае — гэта габіт інструктара, які павінен быць арганізаван у дапамогу рабоце інструктароў, куды ён зможа прыйсці, працытаць матэрыялы і т. д. Вось дзве формы работы з інструктарамі, якія мы ўводзім. Трэба сказаць, што падзвычай мала працуем з інструктарамі на месцы пры выездзе ў вёску. Гэта наш недахоп.

Наступнае мерапрыемства, якое мы праводзім, гэта пасылка работнікаў з апаратаў совецкіх, казённых, гаспадарчых арганізацый раёна на вёску. Сёе-тое ў гэтых адносінах мы зрабілі, хоць тут назіраецца кансерватызм. Вось учора мы бачылі на ўчастку ветдоктара. Ён правёў вялікую работу. Мы выцягваем рабочнікаў з установаў, каб ліквідаваць функцыяналку.

Наступнае мерапрыемства — партдні. Партдні мы пачалі праводзіць рэгулярна 3 і 10 числа кожнага месяца. Заўсёды на правядзенне іх выязджаюць члены бюро і члены райкома партыі.

У нас 26 кустоў. Амаль у кожным сельсавеце мы зараз праводзім партдні ў рашаючых калгасах, дзе ставім даклад парторга, праводзім куставыя нарады партыйцаў, комсамольцаў. Улічваючы першы вопыт партдзён, мы сходы будзем праводзіць не ў сельсаветах, а ў адным з калгасаў данага куста.

У горадзе тое самае. Напрыклад, пытанне аб праверцы выканання рашэнняў партыі аб транспарце паставілі на прадпрыемствах, звязаных з транспартам.

Адносна дапамогі горада вёсцы. Шэфства на сельсаветах мы ліквідавалі і ўвялі шэфства на калгасах. Вылучылі з горада ў вёску каля 75 парторгаў. Яны павінны часта выязджаць для абслугоўвання калгасаў.

Як працуе бюро райкома? Мне гаварылі, што пасяджэнні бюро раней пачыналіся з 10 гадзін раніцы і канчаліся ў 12 вечара. А мы на апошнім пасяджэнні абмяркоўвалі 19 пытанняў, апрача заяў, скаргаў, і ўсяго слядзелі 2 з палавай гадзіны. Паміма таго мы з тав. Шутаўскім распрацоўваем рад пытанняў аператыўна, каб не чакаць пасяджэння бюро. Напрыклад, за адну пяцідзённку — я не гавару аб дробных пытаннях — мы распрацавалі 24 пытанні, якія патрабуюць санкцыі ўсяго бюро.

Цяпер пра ўчот. Учот культае. Мы некаторы час мала ўвагі аддавалі гэтай справе, а без учоту працаваць цяжка. Цяпер надрукавалі дзённік для парторга, праз які атрымліваем прадстаўленне, як у яго праходзіць работа. Гэта арганізоўвае работу парторга.

Аб нашых недахопах. Галоўны недахоп — недастаткова канкрэтны падыход да асобных груп рабочых і прапсаў вытворчасці. Напрыклад, камбінат. Там цэхі рэзка адрозніваюцца адзін ад другога па размяшчэнню рабочых, характару вытворчасці, складу рабочых і т. д. Дыферэнцыяванага падыходу да кожнага працэсу вытворчасці для вырашэння пытанняў, звязаных з промфінпланам, тут не было. На швейнай фабрыцы такое-ж становішча. Там лепшыя ўмовы. Але калі мы гаварылі з парторгам, ён прызнаў нашу памылку ў тым, што мы недастаткова канкрэтна, недыферэнцыявана падышлі да людзей.

Другое, што мы прапусцілі ў вёсцы, гэта пытанне аб актыве—беспартыйным, калгасным. За гэту справу мы не ўзяліся, як след, па-большэвіцку, а асноўны недахоп большэвіка, калі ён не ўмее ўхапіцца за галоўнае звяно. Пытанне актыва з пункту гледжання арганізацыі людзей гэта з'яўляецца ў нас цэнтральным звяном, за якое трэба ўхапіцца. Гэту работу мы надзвычай слаба праводзім, адсюль рад прарываў. Нам неабходна, каб член райкома і сам сакратар райкома спусціліся непасрэдна к актыву, к дзесяцідворцы. У гэтым бясспрэчна ёсць некаторы крок наперад. Бліжэй сталі да вытворчасці, бліжэй сталі да калгаса. Ліквідавалі ў вялікай меры засядацельскую мітусню.

Асноўнае, што трэба зараз рабіць, гэта накіраваць лепшых работнікаў у глыб, у пярвічную партыйную арганізацыю, да актыва беспартыйных, да дзесяцідворак.

Мы зараз так павінны паставіць пытанне: калгасы — цэнтральнае месца для работы з пункту гледжання развіцця с.-г. вытворчасці і з пункту гледжання партыйна-масавай работы для таго, каб уздзейнічаць на аднаасобнікаў. Мы прымем такія меры, як прымацаванне да паасобных вёсак парторгаў з горада для работы з аднаасобнікамі. Слабае месца ў нашай рабоце — гэта гаспадарча-каапаратыўныя арганізацыі. Тут неабходны кансерватызм. За гэту работу мы па-большэвіцку яшчэ не ўзяліся.

КРЫВУЛІН (*Сакратар парткома лесакамбіната*)

ЗНІШЧАЕМ НЕДАХОПЫ НА ХАДУ

На Бабруйскім лесакамбінаце 3.400 рабочых. Партарганізацыя камбіната налічвае 300 членаў і кандыдатаў партыі. Мы маем 15 цэхавых партарганізацый, 20 парт груп і 40 групавых парторгаў.

Пасля апублікавання тэзісаў да XVII з'езда, як вопыт, мы ліквідавалі бюро парт'ячэйкі на біржы піламатэрыялаў. Стварылі там парт арганізацыю на чале з парторгам. Спецыяльна прымацавалі туды таварышоў ад парткамітэта для дапамогі ім у рабоце. Пасля такой перабудовы ў гэтым цэху атрымалі станоўчыя рэзультаты.

Пасля перабудовы партработы парторг перайшоў ад агульных пытанняў да больш канкрэтных. Ён наблізіў сваю работу да комуніста, беспартыйнага рабочага. Даваў канкрэтныя заданні комуністам і ў намечаныя тэрміны правяраў, як гэтыя заданні выконваюцца. Гэта ў значнай меры ўзмацніла партыцыпліну. У гэтым цэху пачалі лепш падрыхтоўваць і праводзіць партыйныя дні.

Пасля апублікавання рашэнняў XVII з'езда на аснове папярэдняга вопыту аднаго цэха мы перабудавалі ўсю партарганізацыю.

Перавыбралі парткамітэт. Замест 25 членаў і 9 кандыдатаў выбралі 9 чал. Апарат парткамітэта складаецца з 3 чалавек: сакратар парткома, інструктар і адзін прапагандыст. Зараз парткамітэт перабудоўвае змест ўсёй партработы. Мы праверылі расстаноўку партыйных сіл партыйных арганізатараў, слм-там перастаўлілі людзей, з такім разлікам, каб усе ўчасткі былі забяспечаны партыйным уплывам.

Як мы кіруем парторгамі?

Пры парткамітэце сістэматычна праводзяцца нарады з парторгамі па пытаннях партработы ў цэху, брыгадзе. На нарадах заслухоўваем даклады парторгаў аб рабоце ў брыгадзе, у цэху. Даем адпаведныя ўстаноўкі і заданні на дэкаду. Парторгі запісваюць заданні. На наступнай нарадзе слухаем інфармацыю парторгаў аб выкананні заданняў, даных партыйным камітэтам. Большасць партарганізатараў вядуць дзённік работы, у які запісваюць толькі рэзультаты праведзенай работы за дзень. Партыйны арганізатар дае заданні групарторгам па пытаннях партыйнай работы. Ёсць цэлы рад фактаў, калі па ініцыятыве групарторгаў ліквідаван рад недахопаў у рабоце прадпрыемства. Возьмем групу тав. Гладышава (лесацэх № 1). Гладышаў — лепшы рабочы камбіната, узорны комуніст, які добра змагаецца за выкананне вытворчай праграмы. У яго ў групе адзін з кандыдатаў партыі не выконваў промфінплана. Тав. Гладышоў склікаў тэрмінова нараду комуністаў, працуючых тут. Абгаварылі гэта

ячэйках пытанні, якія высоўваліся цэхавымі парт'ячэйкамі таксама ўключаліся ў план работы, запісваліся ў блок-нот і ставіліся на бюро для вырашэння. Прымалі доўгія рэзалюцыі і зусім мала займаліся праверкай выканання іх. Зараз гэты недахоп ва многім зжыт. Вось два характэрныя прыклады.

Сакавік для нас быў цяжкім месяцам у выкананні вытворчай праграмы. Была зацяжка з падачай лесапільным заводам лесу белдрэўным і стандартным цэхам. Патрабавалася вялікая напружанасць, выразнасць і аператыўнасць для забеспячэння выканання промфінплана не толькі гэтых цэхаў, але і вырабляючых аднаведнае абсталяванне для іншых заводаў. Каб забяспечыць выкананне промфінплана ўсімі цэхамі, мы пайшлі на Бярэзіну, дзе непасрэдна на месцы ляжаць лесаматэрыялы, правяралі прасоўванне іх на завод. Па ініцыятыве парткома была склікана нарада ў лесацэху № 2. І там прынялі адпаведнае аператыўнае рашэнне. Гэтым мы папярэдзілі вялікі прарыў.

Другі прыклад—па лініі падрыхтоўкі да веснавой пасеўкампаніі на нашай прыгараднай гаспадарцы. Замест таго, каб выклікаць на бюро парткамітэта дырэктара прыгараднай гаспадаркі, я сумесна з дырэктарам камбіната паехалі на прыгарадную гаспадарку, склікалі нараду ўсіх брыгадзіраў, агранома, выявілі ўсе хваравітыя бакі, якія перашкаджаюць своечасоваму разгортванню сяўбы. Там-жа на месцы мы прынялі адпаведныя меры па забеспячэнню кватэрамі рабочых.

Мы маем бясспрэчна і цэлы рад недахопаў у нашай рабоце. Галоўны з іх гэта тое, што карэннай унутранай перабудовы зместу работы нізавога партэвяна як след мы яшчэ не зрабілі.

Як мы арганізавалі прапрацоўку матэрыялаў XVII з'езда? У цэхах прапрацоўку вядуць партарганізатары. Там, дзе партарганізатары недастаткова падрыхтаваны, мы прымацавалі другіх, больш падрыхтаваных работнікаў парткома, заводскага камітэта, інжынерна-тэхнічнага персанала, прапагандыстаў школ і гурткоў. Перад кожнымі заняткамі мы гэтых людзей інструктуем. Інструктаж праводзіць прапагандыст парткамітэта. Парткамітэт па прыкладу парткомаў другіх прадпрыемстваў парашыў правесці грамадска-палітычныя экзамены па праверцы ўсваення рашэнняў XVII з'езда партыі. Для гэтага праводзяцца спецыяльныя кансультацыі па школах, гуртках і зараз пачынаем правядзенне грамадска-палітычных экзаменаў. Рашэнні з'езда прапрацаваны ва ўсіх школах, ва ўсіх цэхах. Арганізаваны спецыяльныя вечары пытанняў і адказаў па рашэннях з'езда.

У лесацэху № 1, рыхтуючыся да палітэкзамена, запрасілі камісара падшэфнай часткі і разам з ім яшчэ раз прапрацоўвалі даклад тав. Сталіна. Мы не гналіся за тым, каб хутчэй пачаць палітэкзамен, а прынялі ўсе меры да таго, каб добра падрыхтаваць нашых комуністаў да здачы экзамена.

Зараз мы праводзім вялікую работу па аўладанню тэхнікай нашай вытворчасці. Мы паставілі перад сабой задачу, каб кожны комуніст да 1-га мая здаў тэхэкзамен на «выдатна». Для гэтай работы прыцягнуты ўсе ІТР камбіната. На сённешні дзень ужо 200 рабочых здалі соцтэхэкзамен, з іх 40 комуністаў.

Дзякуючы вялікай масава-палітычнай рабоце сярод рабочых, узняццю авангардняй ролі комуністаў, камбінат у першым квартале упершыню ў гісторыі яго існавання выканаў промфінплан на 100 проц. Мы яшчэ маем шмат недахопаў у нашай рабоце як у самой партарганізацыі, так і па вытворчасці, гэтыя недахопы ўскрываем і ліквідуем.

ЯСУНАС (*Парторг лесацэха № 1 лесакамбіната*)

ЯК Я ПРАЦУЮ

У нас у лесацэху ўсіх рабочых 400 чалавек з іх 32 комуністы, 48 комсамольцаў. Замест ранейшай парт'ячэйкі з бюро і сакратаром на чале зараз ёсць пярычная цэхпарт арганізацыя з парторгам. Ёсць яшчэ тры зменныя парторгрупы і два групарторгі — адзін на басейне, другі на сартавальнай пляцоўцы. Вось пабудова партарганізацыі лесацэха.

Як-жа я працую? Заданні атрымліваю ад парткамітэта на кожную дэкаду. Я не даю пісьмовых задан парторгам, выклікаю іх кожнага ў адкельнасці і даю асобныя даручэнні. Таксама даю асобныя даручэнні комуністам. Прывяду прыклад аднаго дэкаднага плана парткома і як я яго выконваю. Я павінен прадставіць спіс комуністаў, якія займаюцца тэхнічнай вучобай, падрыхтоўваць і правесці партдзень з наступным парадкам дня: становішча інтэрнацыянальнага выхавання, становішча выходніцтва і рацыяналізатарскіх прапаноў і становішча пашкодженняў работы пад выпрафілактыкі калгасам, інфармацыя цэхавага парторга аб выкананні рашэння папярэдняга партыйнага сходу.

Далей, заданне аб правядзенні палітдня, падрыхтоўка комуністаў да здачы палітэкзамена і падрыхтоўка палітбою паміж цэхамі.

Партдзень я правёў па намечанаму парткомам парадку дня. Правёў палітдзень у інтэрнаце. У школах праводзілі падрыхтоўку да здачы палітэкзамена.

Дэкаднае заданне парткома мною поўнасцю выканана. Як праходзіць мая работа? Прыходжу часта ў цэх, правараю, ці няма прагулаў у цэху. Гэта, па-першае. Далей, правяраю заданні, якія я даваў комуністам, па якіх зыходзіць тэрмін выканання. Цікаўлюся, ці выконваюцца заданні і як выконваюцца. Калі ў нас дзень партвучобы, я папярэджваю кожнага комуніста аб наведванні ім заняткаў.

Прыходзіцца мне часта работу сталоўкі правяраць, якасць абеда. Вось 27 сакавіка пры праверцы аказалася, што ў двух катлах былі добрыя абеды, а ў тэрмасах быў суп вельмі рэдкі. Адразу-ж паклікаў парторга сталоўкі, дырэктара сталоўкі і прыняты меры па паляпшэнні якасці супа.

У нас не было ўліку браку. Па маёй ініцыятыве была склікана нарада адміністратыўна - тэхнічнага персанала. Было пастаўлена пытанне аб наладжанні ўліку браку. Перад выхадным днём склікаем майстроў і рамшчыкаў для таго, каб устанавіць, дзе патрэбен рэмонт і ў выходны дзень механікі і слесары ліквідуюць наўныя недахопы.

Усе гэтыя пытанні праводзяцца мною сумесна з адміністрацыяй цэха. Сакратар ячэйкі раней вырашаў пытанне толькі на бюро, а цяпер непасрэдна я сам адразу-ж на месцы дагаварваюся з кім трэба і вырашаю.

Змяніўся характар партсходаў. На партдні, які адбыўся 17 сакавіка, мы не слухалі агульнага даклада начальніка цэха аб выкананні, якасці прадукцыі, а слухалі асобных рабочых, тых, якія рашаюць выкананне промфінплана, слухалі рамшчыка, начальніка змены, як яны змагаюцца за выкананне промфінплана.

УЗДЗІНСКІ (*Сакратар парткома швейнай фабрыкі*)

УЗНІМАЕЦЦА ЎЗРОВЕНЬ ПАЛІТЫЧНЫХ ВЕДАЎ

Да XVII партз'езда на фабрыцы працавала 1000 чалавек кадравых рабочых. Партарганізацыя налічвае 72 комуністы, з іх 48 членаў і 24 кандыдаты. Да перабудовы партыйнай работы ў нас была цэхавая ячэйка, якая кіравала работай «наогул». Пасля прапрацоўкі тэзісаў тав. Кагановіча аб перабудове партыйнай работы мы прыступілі да арганізацыі партыйных груп. Па ўсіх агрэгатах арганізавалі партгрупы, прычым пазменна.

Партыйныя сілы размеркаваны па арганізацыі прапарцыянальна. Кожная партгрупа мае 5-6-7 комуністаў з кандыдатамі. Такім чынам, асноўных партгруп на прадпрыемстве 9. Гэта зменныя. У кожнай істужцы працуюць таксама комуністы, па 2 у істужцы, з тым каб кожны ўчастак быў забяспечан партыйным уплывам.

Як вядзем работу з парторгамі? Па-першае, склікаем парторгаў агрэгатаў і заслухоўваем інфармацыі, як кожны комуніст выконвае сваю нагрузку і даем заданні. Вось, напрыклад, у апошняй пяцідзённцы сакавіка мы далі два заданні парторгам. Першае—падрыхтоўка комуністаў, комсамольцаў і беспартыйных рабочых-ударнікаў да здачы соцтэхэкзамена на «выдатна».

Другое—прапрацоўка рашэнняў з'езда з комуністамі, комсамольцамі і беспартыйнымі рабочымі. Тут ёсць вялікія дасягненні.

У выводах камісіі па чыстцы нашай арганізацыі адзначана, што ўзровень палітычных ведаў комуністаў вельмі нізкі. Гэта перашкаджала ўзняцці авангардняй ролі комуністаў на вытворчасці. Гэтым і тлумачацца прарывы, якія былі на фабрыцы. Прапрацоўка даклада тав. Сталіна ўзняла энтузіязм усёй партарганізацыі, паказала жаданне комуністаў глыбока аўладаць вучэннем Маркса-Леніна-Сталіна.

Прапрацоўкай матэрыялаў з'езда ахоплены ўсе комуністы. Аб якасці ўсваення даклада т. Сталіна сведчыць такі факт. Спачуваючы тав. Гарцман быў зусім палітычна неразвіты. Зараз на настаўленыя ў першым і другім палітбаі пытанні адказаў на «выдатна». Другі — Славін—пераведзены пры чыстцы з членаў у кандыдаты. Ён цяпер адзін з лепшых на ўсваенне рацэнзіяў з'езда. І не толькі комуністы, але і беспартыйныя работніцы добра ўзяліся за вучобу. Напрыклад, тав. Рухавец, ударніца Хаміля, якая наведвае курсы «Чырвонага крыжа» (там у нас уведзена паліттадзіна). Калі мы абвясцілі палітбой па дакладу т. Сталіна, яны добра адказалі на заданыя пытанні.

Беспартыйныя рабочыя ахоплены прапрацоўкай даклада Сталіна —на партдніях, палітбаях і ў інтэрнатах. При тэхнічнай вучобе мы два разы ў пяцідзённку ўвялі гадзіну палітвучобы.

Горш з комсамолам. У нас абсалютная большасць комсамольцаў (86 чалавек) займаецца ў вечэрняй рабочай школе і на рабфаку, але 25-30 зусім не былі ахоплены палітвучобай. Тут яшчэ неабходна падцягнуцца.

Як я сам працую? Больш бываю ў цэху. Няма таго дня, каб я не гаварыў з парторгам. Пачываючы з IV квартала 1933 г. на фабрыцы сапраўды адчуваецца пералом у рабоце. План IV квартала выкананы поўнасцю. Промфінплан за сакавік выкананы на 106-108 проц., і якасць прадукцыі значна палепшылася. Браку стала менш. У студзені па плану дапускалася 0,75 проц. браку, мы далі ў студзені менш гэтай нормы—0,04, у лютым далі брак 0,2, у сакавіку таксама менш нормы.

Палепшылася работа нізавога друку ў час перабудовы партработы. Часцей выпускаюцца штодзённікі на ўсіх агрэгатах.

Аб нашай рабоце ў вёсцы. Мы прымацавалі асобныя цэхі да калгасаў, але дастатковай дапамогі калгасам яшчэ няма. Пасылкай брыгад у калгасы я сам непасрэдна кірую. Выязджалі брыгады на дапамозе ў праверцы насення. Устанавілі радыё ў цэнтры сельсавета. Правялі сумесна канферэнцыю калгаспіц-ударніц 8 сакавіка. Ставілі спектаклі.

Я быў у калгасе «Новы шлях». У гэтым калгасе па малочнай форме з-за нядбайных адносін даярак здохла адно цяля. Мы дагаварыліся і арганізавалі грамадскі суд над гэтай самай даяркай.

Усе калгасы падрыхтаваны да сяўбы і хоць заўтра ідзі сеяць.

АЛЬПЕРОВІЧ (*Парторг швейнай фабрыкі*)

БОЛЬШ МОЦНЫХ ПРЫМАЦОЎВАЕМ ДА СЛАБЕЙШЫХ

У цэху 130 чалавек, з іх 6 комуністаў, 4 члены партыі і 2 кандыдаты. Мы размеркавалі нагрузкі сярод комуністаў так, што кожны комуніст мае партнагрузку. Усе комуністы ахоплены вучобай. Два комуністы займаюцца на рабфаку, астатнія наведваюць партыйныя школы.

Праведзены палітбой паказаў, што даклад тав. Сталіна комуністы распрацавалі і ўсвоілі добра. Кандыдат партыі тав. Мішчанка, якая пры чыстцы была пераведзена ў спачуваючыя за палітычную непісьменнасць, цяпер адказала на «добра» на ўсе палітычныя пытанні.

Мы практыкавалі такі вопыт: больш моцных комуністаў прымацоўвалі да слабейшых. Гэта давало добрыя рэзультаты. З 130 чал. рабочых цэха у нас 100 чал. ударнікаў. Усе наведваюць школы.

У палітбаі з нашага цэха прымала ўдзел 70 чалавек, якія распрацавалі даклад тав. Сталіна.

З чацвертага квартала 1933 г. наш цэх стаў перадавым па ўсіх паказальніках. У лютым выканалі план на 100 проц.

Пасля перабудовы адчуваецца больш канкрэтнае аператыўнае кіраўніцтва практычнай работай. Да перабудовы ўсе ўзнікаючыя пытанні абмяркоўваліся на бюро парт'ячэйкі. Гэта затрымвала вырашэнне таго ці іншага пытання. Цяпер я, як парторг, адказваю за ўсю нашу работу ў цэху. Усе пытанні вырашаюцца аператыўна тут-жа, без усякіх пасяджэнняў.

Адчуваю ў рабоце штодзённага кіраўніцтва і дапамогу сакратара парткамітэта. Ён мне дае план на пяцідзённку, растлумачвае, што трэба зрабіць, як падыйсці да пытання.

Вось, напрыклад, у гэту пяцідзённку мне дана заданне ахапіць беспартыйную моладзь вывучэннем даклада тав. Сталіна, забяспечыць іх удзел у палітбаі і ўцягнуць беспартыйную моладзь у тэхнічную вучобу. Я гэта зрабіла, дабіўшыся добрых рэзультатаў. З прапрацоўкай даклада т. Сталіна акуратна кожную пяцідзённку выходзіць штодзённка. Кожны дзень склікаем сходы па істужках, змена-вытворчыя на 15-20 мінут па пытаннях промфінплана, па якасці і колькасці.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

БАБРУЙСКАЯ КУСТАВАЯ НАРАДА ПА ПЕРАБУДОВЕ ПАРТРАБОТЫ

АСНОУНЫ СЭНС ПЕРАБУДОВЫ У ТЫМ, КАБ ЧЛЕН ПАРТЫІ СТАУ У ЦЭНТРЫ РАБОТЫ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

ЭФРОН *(Інструктар па прамысловасці Бабруйскага райкома КП(б)Б)*

ПАЧЫНАЮ ВЫВУЧАЦЬ ЭКАНОМІКУ ПРАЦЫ І ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Інструктарам я працую з пачатку сакавіка. Амаль заўсёды знаходжуся на вытворчасці. Перабудоўваць работу я пачаў такім чынам: выбраў некалькі найбольш рапаючых прадпрыемстваў і некалькі слабых участкаў, каб там перабудаваць работу і ўзорна яе наладзіць.

Возьмем фанерны завод № 16. Калі раней, да перабудовы, заданні даваліся парткамітэтам агульныя, то зараз парткамітэт прапрацоўвае заданні сумесна з парторгамі. Кожны партарганізатар цэха атрымлівае аператыўныя заданні на 5 дзён.

У результаце перабудовы партработы мы дабіліся на гэтым заводзе паступных вынікаў. Промфінплан за сакавік, пасля перабудовы выконваецца на 115-117 проц. Я не лічу апошніх дзён, калі работа спынілася з-за адсутнасці сыравіны. Прычым брак значна паменшыўся.

Калі я прыйшоў на завод, я ўбачыў, што адно з самых балючых пытанняў гэта палітычнае выхаванне. У партыйнай сетцы займаюцца нават не ўсе члены партыі. Мы ўзяліся за прапрацоўку рашэнняў XVII з'езда. Мы разам з сакратаром парткамітэта, з членам парткома распрацавалі план. Падабраў добрага прапагандыста і наладзіў партвучобу. Пасля гэтага пераключыўся на другія участкі.

За кароткі перыяд маёй работы мне прышлося займацца і гаспадарчымі пытаннямі, хоць яны не адніналі шмат часу. Бываюць такія выпадкі, калі сапраўды патрабуецца мясцовае ўмяшанне ў справу не жаўрэдна вытворчую. Адразу-ж прымаю меры. Есць у нас хлебазавод. Гэтым заводам я займаюся амаль штодзённа. Сёння яшчэ не магу дакладна сказаць, што мне ўдалося выцягнуць завод у перадавыя, але мне ўдалося высветліць, у чым там недахопы і намеціць рад мер, якія трэба правесці для аздараўлення работы завода. Там і партарганізацыя слабенькая, і наогул слабы ўчастак. Лічу, што сюды я павінен накіроўваць асноўную ўвагу.

Другі прыклад — металазавод імя Сталіна. Партарганізацыя тут слабая, кіраўніцтва таксама. Процант браку жудасны. У лютым брак даходзіў да 30 проц. Сабралі спецыялістаў, рабочых. Нам удалося ў сакавіку знізіць процант браку да 10-ці.

Як сказаў у пачатку, я ўзяўся за некалькі рашаючых прадпрыемстваў — з аднаго боку, і слабыя ўчасткі — з другога. Цяпер скажу аб недахопах, што я заўважыў, як слабасць па маёй лініі ў рабоце.

Асноўная работа інструктара звод зіцца да таго, каб ён мог штодзен на кіраваць пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі аператыўна. А ў нас атрымліваецца, у сувязі з тым, што ліквідавалі кантрольныя камісіі, ўвесь матэрыял ідзе да інструктара. Тут і са «Звязды», і з «Рабочего», і «Окнябра», і «Лесной промышленности». Матэрыялы вельмі сур'ёзныя, якімі трэба займацца, расследваць. І цяпер усё гэта ідзе да нас інструктароў. І не кожную справу можна даручыць любому члену партыі расследваць. Прыходзіцца шмат свайго рабочага часу аддаваць гэтаму. Тут трэба нешта зрабіць. Трэба мець актыў з членаў партыі, працуючых на вытворчасці, які павінен быць згрупаван вакол гэтага інструктара.

Я ўжо маю такіх членаў партыі, якія дапамагаюць мне. Але трэба мець хоць-бы трох пазаштатных інструктароў, якія былі-б вызвалены ад іншых нагрузак. Я маю пазаштатнага інструктара, але ён працуе парторгам ў калгасе і калі трэба — ён едзе ў вёску. Людзі, якія выдзяляюцца ў дапамогу інструктару, якіх ён падбірае сабе, павінны быць вызвалены ад усіх іншых нагрузак, каб яны маглі сапраўды дапамагаць інструктарам.

Зараз аб прыкладзе добрай арганізацыі працы. У нас ёсць мясакамбінат. Там кожны рабочы, прыходзячы на працу, ведае, колькі ён учора зарабіў. Арганізацыя і ўлік працы там пастаўлены ўзорна. Вопыт мясакамбіната мы зараз пераносім на іншыя прадпрыемствы.

На гэтай рабоце я чалавек новы. Адсюль вывад, што асаблівую ўвагу зварачаю на тое, каб навучыцца добра працаваць, аўладаць тэхнікай сваёй вытворчасці. Разумею таксама, што шмат увагі трэба аддаць павышэнню свайго ідэйна-тэарытычнага ўзроўню. У бліжэйшы час пачну вывучаць эканоміку працы ў прамысловасці.

ЯНОВІЧ *(Прапагандыст Старцаўскага сельсовета)*

ПАДРЫХТОЎКА ДА ПАРТДНЯ — ВАЖНАЯ СПРАВА

Раней я працаваў сакратаром Старцаўскай партыйнай тэрытарыяльнай ячэйкі. Потым, так з 1 сакавіка мяне прызначылі прапагандыстам ў дапамогу інструктару райкома. Зайшоў у Дом комасветы і пагаварыў з тав. Шупікавым. Ён мне расказаў пра мае абавязкі, што перш за ўсё трэба з комуністамі прапрацаваць рашэнні XVII партз'езда.

Прыехаўшы на месца, я даведаўся, што ні адна тэрытарыяльная партарганізацыя, ні парторг не прапрацавалі глыбока даклада тав. Сталіна. Яны толькі на партсходзе станілі агульны даклад аб XVII з'ездзе.

Першае, чым я заняўся, гэта падрыхтоўкай комуністаў да партдня. На партсходзе стаяла пытанне аб нацыяльнай партыі. Склаў пытальнікі, запрасіў старшынь калгасаў, актыў, комсамольцаў, настаўнікаў і прапрацавалі гэта к партдню.

У Селішчы прапрацоўваў XVII партз'езд. Склікаў усіх комуністаў і комсамольцаў, былі і беспартыйныя брыгадзіры калгасаў. Прапрацавалі мы два разделы даклада тав. Сталіна. Асобны ўпор зрабіў на пытанні жывёлагадоўлі ў святле ўказанняў т. Сталіна. У якасці дапаможнага матэрыяла выкарыстоўваў куток прапагандыста ў «Правде».

Прапрацоўку раздзела даклада Сталіна аб жывёлагадоўлі ўвязалі з пастановай пленума райкома і адначасова прапрацоўвалі урокі касцюковіцкай і дубровенскай справы. Тут-жа былі прыведзены факты агідных адносін да справы жывёлагадоўлі ў гэтых калгасах. Пасля прапрацоўкі мы праводзілі дзень актыва па пытанню жывёлагадоўлі.

За час маёй работы да мяне прыходзілі настаўнікі і пыталіся, колькі ў нас класаў. Адзін так тлумачыў, што ў нас толькі адзін рабочы клас і больш класаў няма. Я ім адказаў, што ў нас два асноўныя класы: рабочы клас і сялянства.

Некаторыя блыталіся ў пытанні аб дэпрэсіі. Яны думалі, што з цяперашняй дэпрэсіі капіталізм зноў дасягне ўзроўню развіцця 1929 г. Я і гэта пытанне ім растлумачыў згодна ўказання т. Сталіна.

ГАРЭЛІК *(Парторг фанернага завода № 16)*

ПАРТКОМ ПРАВЯРАЕ МАЮ РАБОТУ

Сакратаром ячэйкі я працаваў амаль год. Тады ў мяне збіралася шмат пытанняў, вырашаць іх да пасяджэнняў бюро я не мог. Склікаць бюро было вельмі цяжка, бо ніяк нельга было сабраць членаў бюро. Цяпер я атрымліваю кожную пяціднёўку канкрэтнае заданне, збіраю партгрупу і ўказваю кожнаму, што трэба прарабіць на гэту пяціднёўку, даю заданне кожнаму партыйцу, а пазаўтра правяраю як яно выконваецца.

Пасля перабудовы работы ўсе партыйцы нашай групы акуратна наведваюць школы, з'яўляюцца членамі Асоавіяхіма. 35 слесараў, цесляроў, токараў здалі норму на варашылаўскага стралка. Усе рабочыя—ударнікі ашчадкасы.

Наш цэх асноўны, мы змагаемся за якасць прадукцыі і ліквідацыю прастояў. Партыйны дзень быў 28 сакавіка. Мы прапрацоўвалі даклад тав. Сталіна. 29 быў палітэкзамен.

Я ўзнімаў некаторыя пытанні перад парткамітэтам. Яны былі вырашаны. Парткамітэт, з свайго боку, дае мне заданні і правярае як я працую.

Агульны від нарады парторгаў.

КУНІЦКІ *(Кіраўнік партыйна-комсамольскай групы калгаса „Селішча")*

АКТЫЎ КАЛГАСА—НА АДКАЗНЫХ УЧАСТКАХ

У нашым калгасе адзін партыец, адзін спачуваючы і 7 комсамольцаў. Комсамольцы расстаўлены на адказных участках работы ў калгасе. Яны працуюць на свінарніку, на канюшні, кладаўшчыкамі. У зімовы час комсамольцы былі на адказных мясцах на лесавывазцы. Дзякуючы іх рабоце квартальны план выканан поўнасцю.

Цяпер аб веснавой пасеўкампаніі. Усе пытанні я абмяркоўваю з комсамольцамі і на актыве. Потым стаўлю іх на агульным сходзе. Раней я атрымліваў дырэктывы ад сакратара вясковай ячэйкі, цяперка — непасрэдна ад райкома, ад інструктара і праводжу іх у жыццё. Работа зараз пастаўлена значна лепш чым раней. Сакратар тэрытарыяльнай ячэйкі не мог ахапіць усе пытанні, рэдка бываў у калгасе, а я сам рэагую на ўсе ненармальнасці.

Рашэнні XVII партз'езда прапрацоўвалі ў комсамольскай ячэйцы, з актывам калгаснікаў, а таксама на агульных сходах калгаснікаў. 25 быў склікан актыў, дзе стаяла пытанне аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Там-жа абмеркавалі кандыдатуры звеньявых і сейбітаў. Мы гэта ўсё абгаварвалі для таго, каб своечасова і добраякасна правесці веснавую сяўбу. Актыў калгаса таксама расстаўлен па адказных участках.

Матэрыял арганізаван брыгадай „Звязды" ў складзе таварышоў А. ДЖЭЛЮКА, А. ЛЕВІНА і В. МЯДЗВЕДЗЕВА

САРОКА *(Інструктар Бабруйскага райкома КП(б)Б)*

ЯК МЫ ЗМАГАЕМСЯ ЗА ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЮ

27 сакавіка мы склікалі нараду актыва, на якой прысутнічалі комуністы, комсамольцы — члены сельсовета, упаўнаважаныя дзесяцідворак, пастаўнікі. Мы з імі разгледзелі наступныя пытанні: аб аператыўным кіраўніцтве сяўбой, аб звенневай сістэме, аб рабоце дэпутацкай групы і ўпаўнаважаных дзесяцідворак, аб ажыўленні сельскагаспадарчага руху і барацьбы за захаванне цялят.

Створаны былі брыгады для агляду і праверкі выканання рашэнняў партыі аб жывёлагадоўлі. 31 раніцою мы правяралі выкананне канкрэтных заданняў, складалі план партдня 3 красавіка.

Вось які результат дала адна заметка, змешчаная ў насценгазеце. Вось артыкул пад загалоўкам **«Барацьба кулака з нажом супроць рашэнняў партыі»:**

> «XVII партыйны з'езд паставіў перад калгаснай сістэмай, як цэнтральную задачу, развіццё жывёлагадоўлі. Абгаварыўшы матэрыял XVII партз'езда на агульным сходзе калгаснікаў, кожны калгаснік узяў на сябе абавязак выгадаваць 3 цялят са сваёй неаграмаджанай каровы для пашырэння калгаснага стада. Пасля рашэння калгаснікаў ку лак павёў шалёную агітацыю супроць гэтага рашэння, за знішчэнне маладняка. Першым паказаў прыклад кулак Борбут Рыгор, а за ім пацягнулася група, якая таксама за рэзала сваіх цялят. Вось гэтыя «героі»: Праковіч Рыгор Данілаў, Кулік Сцяпан Хведараў і рахункавод калгаса.
>
> Не па гэтаму кулацкаму шляху прыдзем да заможнага жыцця ў калгасе. Ведайце, калгаснікі, выгадаваць цялё, гэта справа гонару кожнага калгасніка, задача кожнага калгасніка. Вырваць нож з рук тых калгаснікаў, якія замахнуліся нажом на горла маладняка! Тав. Какоўка Янка Кузьмоў, пакладзі нож, апомніся, бо не ў тваіх інтарэсах зарэзаць сваё цялё.
>
> **Ведаючы».**

На агульным сходзе, два абмяркоўваліся сігналы друку, першы выступіў Дрык Іван. З апушчанай галавой ён заяўляе: **«Таварышы, я зрабіў вялікую палітычную памылку, але я яе гатоў справіць. Запішыце, што я дастану і выгадую цялё для пашырэння калгаснага стада».** Далей выступілі і другія калгаснікі. Усе кажуць: «і мяне запішыце, і мяне». Кожны даў абавязацельства, што на працягу бліжайшых некалькіх дзён ён дае цялё.

НАВІЦКІ *(Парторг калгаса імя 518)*

БЛІЖЭЙ ПАДЫШЛІ ДА КАЛГАСНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

У нас у 1933 г. быў сакратар, які кіраваў сельсоветам. Пры гэтым кіраўніцтве ў нас было недавыкананне ўсіх сельска-гаспадарчых работ. Пасля перабудовы партарганізацыі работа палепшылася.

Мы бліжэй падышлі да калгаснай вытворчасці, у нас колькасць ударнікаў павялічваецца, напрыклад, першая брыгада па вывазцы гною выканала план на 150 проц. Шырока разгарнулася соцспаборніцтва паміж брыгадамі і звенямі.

У нас ў канцы 1933 года арганізавана партыйная група. У гэту групу ўвайшлі два члены партыі, адзін кандыдат. Мы правялі чатыры партсходы. На партсходзе прыязджалі з райкома партыі. На партсходах ставіліся пытанні аб выкананні гасадарча-палітычных кампаній, аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, рамонту сельска-гаспадарчых машын і іншага інвентара.

Усе гаспадарча-палітычныя кампаніі па калгасу «518» былі выкананы своечасова.

Арганізацыя працы ў калгасе. У 1933 г. у час пасеўнай кампаніі ў калгасе было 18 гаспадарак, цяпер 40. Арганізаваны дзве паляводчыя брыгады, якія прымацаваны да пэўных участкаў.

11 сакавіка ў нас быў пробны выезд у поле. Ён паказаў добрую падрыхтаванасць калгаса да выхаду ў поле. У пробным выездзе прымалі ўдзел і адначасобнікі. Калгаснікі ў час выезду ўзялі на сябе абавязак закончыць сяўбу за 15 дзён.

П. КОРЧЫК

НАЦЫЯНАЛ-АПАРТУНІЗМ У КПЗБ І ІДЭАЛАГІЧНАЯ СПАДЧЫНА „БЕЛАРУСКАЙ РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ"

Выкрыццё контррэволюцыйнай нацыяналістычнай беларускай арганізацыі ў БССР, на чале якой стаялі былыя дзеячы Грамады і «Змагання» — Рак-Міхайлоўскі, Мятла, Дварчанін, Гаўрылок і інш., а таксама здэмаскаванне агентаў польскай дэфензывы і беларускага нацыянал-фашызма ў верхавіне ТБШ нанеслі жорсткі ўдар махінацыям беларускага нацыянал-фашызма і польскага імперыялізма. З гэтага пункту погляду, асабліва калі прыняць пад увагу, што асноўная мята гэтых агентур была нанесці рэволюцыйнаму руху ўдар у рашаючы момант, здэмаскаванне іх павінна распэньвацца, як перамога рэволюцыйнага руху. Але разам з тым тая акалічнасць, што гэтым агентам удалося пранікнуць у рэволюцыйны рух, а іх дзейнасць на працягу доўгага часу заставалася нявыяўленай, сведчыць аб недастатковай большэвіцкай пільнасці КПЗБ.

Польскі імперыялізм надае асаблівае значэнне Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, як плацдарму для ваеннага нападу на СССР. З гэтай прычыны, побач з узмоцненым тэрорам, польская дэфензыва прымяняе асабліва ўтончаныя метады па разгрому і развальванню рэволюцыйнага руху на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне. Акупацыя і дзікі нацыянальны ўціск польскага імперыялізма на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне аблягчае беларускай і украінскай буржуазіі маскаваць сваю контррэволюцыйную дзейнасць пад плашчом барацьбітоў за нацыянальнае вызваленне.

Магутны размах і сіла нацыянальна-вызваленчага руху на Заходняй Беларусі, які ўзмацняецца пад непасрэдным уплывам БССР і развіваецца пад кіраўніцтвам КПЗБ, прымушае беларускую буржуазію ўсё шырэй прымяняць метады маскавання рэволюцыйнай фразай, метады правакацыі і заканспіраванай дзейнасці сваіх агентаў у арганізацыях рэволюцыйнага руху.

Усё гэта патрабуе ад партыі ўзмоцненай барацьбы з нацыяналізмам, патрабуе ідэалагічнай загартаванасці яе кадраў, большэвіцкай рэволюцыйнай непрымірымасці ў барацьбе з нацыяналістычнай ідэалогіяй і хітрымі махінацыямі клясавага ворага. Рад акалічнасцей, у першую чаргу не ажытая да канца нацыяналістычная спадчына розных увайшоўшых у партыю груп, слабасць пролетарскага ядра ў партыі, націск на яе дробна-буржуазнай сялянскай стыхіі адбіліся на замаруджанні тэмпу большэвізацыі КПЗБ. Слабасці і недахопы КПЗБ у гэтых умовах у пэўнай меры аблягчалі дзейнасць агентур беларускага нацыянал-фашызма і польскага імперыялізма.

Гэтымі прычынамі тлумачыцца той факт, што на працягу раду год вядомыя кіраўнікі беларускай контррэволюцыі, якія ў часе грамадзянскай вайны і інтэрвенцыі не раз праяўлялі сябе, як адкрытыя і непрымірымыя ворагі Окнябрскай рэволюцыі і агенты польскіх, нямецкіх, французскіх і іншых імперыялістаў, у тым ліку людзі, якія арганізоўвалі паўстанні супроць совецкай улады і актыўна дапамагалі інтэрвентам, што гэтыя людзі маглі пралезці ў рэволюцыйныя арганізацыі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху і нават станавіцца на чале іх, адыгрываць ролю рэволюцыянераў, уваходзіць у давер'е партыі, а некаторыя нават уступіць у партыю. У выніку гэтага падобным тыпам удавалася сваю брудную справу давесці да таго, што яны маглі эміграваць у БССР у якасці «рэволюцыйных барацьбітоў» і займаць там адказныя пасады з мэтай арганізацыі кулацтва, падрыву соцыялістычнага будаўніцтва, развальвання калгасаў і папросту весці шпіёнскую работу на карысць польскага або нямецкага генеральных штабаў, падрыхтоўваць інтэрвенцыю імперыялістычных дзяржаў, каб паняволіць БССР і разграміць СССР.

Рад другіх, менш яркіх, але ўсё-ж важных фактаў таксама сведчаць аб недастатковай барацьбе нашай партыі супроць буржуазнага беларускага нацыяналізма, супроць націску на нашы рады нацыяналістычнай ідэалогіі, супроць нацыянал-апартунізма ў нашых улас ных радах. Рэзалюцыя II пленума ЦК КПП, як і студзеньская рэзалюцыя ЦК КПЗБ, зусім правільна падкрэсліваюць, што КПЗБ не дала адразу належнага адпору беларускаму нацыяналізму, які за апошні час разгарнуў асаблівую актыўнасць у барацьбе супроць СССР і рэволюцыйнага руху ў Польшчы, не здэмаскавала своечасова контррэволюцыйных махінацый беларускага нацыянал-фашызма. Здрадніцтва з боку паасобных членаў галоўнай управы ТБШ, іх агітацыя за супрацоўніцтва ТБШ з польскімі фашысцкімі арганізацыямі і беларускай хадэцыяй, іх удзел у правядзенні свята беларускай контррэволюцыі—гадавіны праклямавання так званай БНР (Беларускай народнай распублікі), іх контррэволюцыйныя выступленні на працэсе галоўнай управы ТБШ,—доўгі час мы не толькі не выкрывалі перад масамі, а памылкова ацэньвалі, як хістанне інтэлігенцкіх элементаў. Паасобныя члены партыі, асабліва працаваўшыя ў арганізацыях нацыянальна-вызваленчага руху, самі паддаваліся націску нацыяналізма і цягнуліся ў хвасце агентаў нацыянал-фашызма.

Недастатковасць большэвіцкай пільнасці і непрымірымасці ў барацьбе з буржуазным нацыяналізмам з'яўляецца асабліва грозным небяспекай у даны момант, у момант абвостранай класавай барацьбы і непасрэдна навісшай пагрозы імперыялістычных войн, асабліва контррэволюцыйнай вайны супроць СССР.

Барацьба з нацыянал-апартунізмам стаіць перад партыяй як асабліва актуальная задача. Але для таго, каб да канца перамагчы нацыянал-апартунізм і гніла-ліберальныя адносіны да націску буржуазнага нацыяналізма, мы павінны бязлітасна ўскрыць іх карэнні. **Карэнні гэтыя ляжаць у нязжытых яшчэ да канца астатках нацыяналістычнай ідэалогіі, унесеных у нашу партыю рознастайнымі групамі і элементамі, якія ўвабрала партыя па меры яе росту.**

Нацыяналістычныя элементы тармазілі і тармозяць да гэтага часу працэс большэвізацыі нашай партыі. Нацыянал-апартунізм у КПЗБ—гэта ў першую чаргу спадчына неперамоганай да канца нацыяналістычнай ідэалогіі беларускай, т. зв. «рэволюцыйнай» арганізацыі, якая ўлілася ў партыю ў канцы 1923 года.

Надзвычай слабая праца ў галіне ўзняцця ідэалагічнага ўзроўню нашай партыі, выяўлення і высвятлення ўсяго, што засмечвала ідэалогію нашай партыі, спрыяла і спрыяе існаванню і пастаяннаму адраджэнню нацыянал-апартунізма. КПП, выкоўваючы пад кіраўніцтвам свайго абноўленага ЦК большэвіцкую лінію ў барацьбе з ухіламі, і ў першую чаргу ў барацьбе з праваапартуністычнай групай Варскага-Кастшэвы, правяла ўжо велізарную работу для ўзмацнення ідэалагічных устояў партыі, для перамагання перажыткаў люксембургізма і меншавіцкай спадчыны ППС-лівіцы. Але адпаведная работа ў КПЗБ у адносінах яе мінулага ўвогуле яшчэ не распачата. А якраз гэтай мінуўшчыны ў нашых спецыфічных умовах раёна і робіць націск на нашу партыю ў непарамнальна большай меры.

КПЗБ складалася ў асаблівых умовах. Заходняя Беларусь мае слаўныя рэволюцыйныя традыцыі буйных баёў пролетарыята ў 1905 годзе пад кіраўніцтвам большэвіцкіх арганізацый, а таксама гераічную барацьбу пролетарыята і сялянскіх мас пад кіраўніцтвам большэвікоў за совецкую ўладу супольна з Чырвонай арміяй у 1918-20 г. г. Вытокі КПЗБ, значыцца, былі іменна ў гэтых арганізацыях, з якіх паўсталі арганізацыі КПРП на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Кадры гэтых арганізацый, хоць значна лікам зменшыўшыяся пад ударамі затрыумфаваўшай контррэволюцыі, пасля грамадзянскай вайны, асабліва пасля польска-совецкай вайны былі і асталіся ядром КПЗБ.

У тыпова сялянскай краіне з адносна слабым прамысловым пролетарыятам і пераважай у ім дробна-прамысловага і саматужна-рамесніцкага тыпу рабочых, цесна звязаных і паддаючыхся ўплыву дробна-мяшчанскага і сялянскага асяродзішча, прытым у краіне з асаблівым пераплётам нацыянальных адносін—мы маем, з аднаго боку, значны ўплыў і традыцыі рэфармісцкіх соцыял-здрадніцкіх партый (ППС, Бунд і інш.), з другога — вельмі значны ўплыў нацыяналізма.

Перамога пролетарскай рэволюцыі ў былой царскай імперыі, наспяванне рэволюцыйных падзей у Заходняй Еўропе і ў самой Польшчы ва ўмовах узрастаючай эксплаатацыі рабочага класа, абяднення мас сялянства і вострага нацыянальнага ўціску спрыяюць шпаркай адбудове і росту комуністычных арганізацый у Заходняй Беларусі, у першую чаргу за лік уцягнення лепшых рабочых (Беласток, Вільня, Берасце, Горадня) і сялянскіх элементаў (Берасцеўшчына). Але гэты рост ва ўмовах быстрай радыкалізацыі мас іншоў таксама і за лік напливу цэлых груп левых апазіцый розных згодніцкіх рабочых і сялянскіх партый (Бунд, ПЦ, ППС, анархісты, Беларуская рэволюцыйная арганізацыя і т. д.), пры гэтым не толькі іх радавых членаў, але часта і кіраўнікоў. Уваходзячы кампактнай масай у партыю, кожная з гэтых груп прыносіла з сабой значны багаж сваіх згодніцкіх, рэфармісцкіх, нацыяналістычных, дробна-мяшчанскіх традыцый і ідэалогіі.

Усё гэта патрабавала паглыбленай ідэалагічнай працы і бязлітаснай крытыкі чужых ідэалагічных уплываў, асабліва напружанай барацьбы за большэвізацыю партыі. У сапраўднасці-ж, з прычыны слабасці асноўных большэвіцкіх і эсдэкаплёўскіх *) кадраў, працэс перавыхоўвання масы новых членаў партыі і выкарчоўвання перажыткаў клясава-чужой ідэалогіі быў моцна затруднёны і затарможан. Не менш важнай акалічнасцю, тармазіўшай гэты працэс, быў той факт, што кіраўніцтва ўсёй КПП знаходзілася тады ў руках правай групай Кастшэвы-Варскага, праяўляўшай ліберальныя адносіны да выхадцаў з рэфармісцкіх і нацыяналістычных партый і прыміранцтва да ўплыву на партыю варожых ідэалогій.

(Працяг будзе).

*) Соцыял-дэмакратыя Польшчы і Літвы.

Линейная калибровочная мишень LR1-BE4-V2

НА ДАПАМОГУ ЧЭЛЮСКІНЦАМ

УСЕ САМАЛЁТЫ ЗВЯНА КАМАНІНА ЗНОЙДЗЕНЫ

ПЕТРАПАЎЛАЎСК - НА - КАМЧАТЦЫ, 6 красавіка. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Праўды»).

Знойдзены ўсе 5 самалётаў экіпажа звяна Каманіна, аб якіх не было ніякіх паведамленняў на працягу некалькіх дзён. Як вядома, 2 самалёты, адным з якіх кіруе начальнік звяна т. Каманін, а другім лётчык Молакаў, знялеціўшы курс, прыляцелі ва Уэлен пасля некалькіх спроб пераматчы Анадыр скі хрыбет (маршрут ад Анадыра да Ванкарэма праз бухту Правідзенне і Уэлен складае каля 1200 клм., карацейшы шлях праз хрыбет — прыблізна 500 клм.).

Трэці самалёт, якім кіруе лётчык Півенштэйн, знаходзіцца на мысе Берынга.

Учора стала вядома, што за 20 клм. ад Анадыра з прычыны тумана апусціўся чацверты самалёт звяна Каманіна, якім кіруе лётчык Дзежідаў. Нарэшце, таксама ў раёне Анадыра знойдзен апошні 5-ты самалёт гэтага звяна—лётчыка тав Бестанжыова.

Вось як гэта здарылася. 5 красавіка позна вечарам у Анадыр у паўзамёрзшым стане прыпоў мехэнік пятага самалёта каманінскай групы т. Разін. Ён паведаміў, што самалёт ляжыць разбітым на паўднёвы захад ад Анадыра і што лётчык Бестанжыеў, борт-механік Ра маноўскі і ён, Разін, пасля аварыі пашлі шукаць населены пункт, але разышліся ў тундры.

Пагранічнікі Анадыра неадкладна арганізавалі пошукі на нартах. Пошукі працяваліся ўсю мінулую ноч. Сёння ўвечары Бестанжыеў і Рамановскі знойдзены і дастаўлены ў Анадыр

НЕ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ЛЮТУЮЧЫ ШТОРМ ГЕРАІЧНЫ ПАХОД „КРАСИНА“

ЛЕДАКОЛ «КРАСИН», 6 красавіка (БЕЛТА).

2-га красавіка ў раёне Озорскіх астравоў ледакол папаў у паласу шторму. Не гледзячы на буру, лівень, град, навальніцу, ён ішоў на перад генеральным курсам.

Шторм бушаваў увесь дзень 3-га красавіка, дасягаючы часамі 10 балаў. Ледакол нахіляўся на 40 градусаў. У ноч на 4-е закрытыя густой імглой асталіся ззаду Озорскія астравы. 5 красавіка — чацверты дзень у паласе ярасных цыклонаў. Дзень і ноч хвалі перакатваюцца па палубе. Вада пеніцца, плюскоча на капітанскі мосцік, нос карабля зарываецца ў ваду, налятае шквал, і, перавальваючыся з борта на борт, скрозь шалёны вецер веснавой Атлантыкі «Красін» упарта ідзе наперад.

У ЛАГЕРЫ ГАТОВЫ ПАСАДАЧНЫЯ ПЛЯЦОЎКІ

ВАНКАРЭМ. 6, красавіка. (Па радыё).

Непагода прадаўжаецца, але ёсць віды на палепшанне. Самалёты астаюцца на ранейшых мясцах. У лагеры надвор'е добрае. Паводле паведамлення Шмідта, адна пляцоўка даўжынёй у 470 метраў сёння адноўлена. Расчыстка другой заканчваецца заўтра. Дні праз тры будзе гатова трэцяя.

Пачатак палётаў затрымліваецца з-за адсутнасці лётнай пагоды на ўзбярэжжы. Радыё-станцыя Шмідта забяспечана электраэнергіяй па два тыдні. За гэты час самалётамі будуць дастаўлены новыя акумулятары.

УШАКОЎ, ПЕТРОЎ.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС

7 красавіка ў канферэнц-зале НКЗС адбылося падпісанне пратакола аб прадоўжанні тэрмінам да канца 1945 г. дзеяння падпісанага ў горадзе Гельсінгфорсе 21 студзеня 1932 г. совецка-фінляндскага дагавору аб ненападзе і мірным улаждканні канфліктаў. Пратакол па свайму зместу аналагічан пратаколам, падпісаным 4 красавіка 1934 г. з Эстоніяй, Латвіяй і Літвой.

З боку СССР пратакол падпісаў народны камісар па замежных справах т. М. М. Літвінаў, з боку Фінляндыі — фінскі пасланнік барон Ір'е Коскінен.

Пасля падпісання пратакола тав. Літвінаў і барон Ір'е Коскінен абмяняліся кароткімі прывітальнымі прамовамі.

Пры падпісанні пратакола прысутнічалі чыны фінляндскай місіі і адказныя супрацоўнікі НКЗС, а таксама прыбыўшая ўчора ў Маскву група фінскіх журналістаў у поўным складзе.

ПРЫГАВОР ЗАБОЙЦАМ РУМЫНСКАГА ПРЭМ'ЕРА

ВЕНА, 6 красавіка. (БЕЛТА).

Бухарэсцкі ваенны суд вынес прыгавор па справе забойцаў прэм'ера Дука.

Трое забойцаў Канстантынеску, Белімака і Караміка прыгавораны да пажыццёвай катаргі, 50 абвінавачаных — лідэры і актывісты фашысткай «жалезнай гвардыі» — апраўданы, у тым ліку дэпутат Зелеа-Кодрэану і кіраўнік штаба «жалезнай гвардыі» генерал Кантакузіно. Апраўданне іх, рэкамендаванае ваенным пракурорам, выклікала здзіўленне ў палітычных колах.

Гэта рашэнне суда расцэньваецца як дэзавуіраванне ўрада з боку генеральскай клікі і рэабілітацыя распушчанай урадам «жалезнай гвардыі». У сувязі з гэтым у Бухарэсце цыркулюць чуткі аб пахіснуўшымся становішчы ўрада Татарэску.

Урад учора ноччу абвергнуў чуткі аб уходзе ў адстаўку, аднак, прэм'ер Татарэску ў заяве прадстаўнікам друку ахарактарызаваў палітычнае становішча, як вельмі сур'ёзнае. Пасля рашэння ваеннага суда Татарэску быў прынят каралём. Паведамляюць, што Татарэску патрабаваў выдання маніфеста, якім урад зноў быў-бы ўпаўнаважан «прыняць энергічныя меры супроць усіх тэрарыстычных арганізацый».

ЗАЯВА ТЫТУЛЕСКУ

ВЕНА, 6 красавіка. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Бухарэста, румынскі міністр замежных спраў Тытулеску заявіў у парламенце, што зацвярджэнне канвенцыі на вызначэнню нападаючага боку, падпісанай у мінулым годзе ў Лондане, адкрывае магчымасць развіцця румына-совецкіх адносін.

ПРАЦЭС 50 КОМУНІСТЫЧНЫХ РАБОЧЫХ

БЕРЛІН, 6 красавіка. (БЕЛТА).

У Гамбургу пачаўся працэс 50 комуністычных рабочых, якія абвінавачваюцца ў сутычках з нацыянал-соцыялістамі ў 1932-33 г. г.

УСЕАГУЛЬНЫЯ ЗАБАСТОЎКІ Ў ІСПАНІІ

ПАРЫЖ, 6 красавіка. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Іспаніі, у Сарагосе аб'яўлена 48-гадзінная ўсеагульная забастоўка пратэсту супроць рэпрэсій улад і прадпрыемцаў пасля нядаўняй усеагульнай забастоўкі. Усе прадпрыемствы сталі. Улады закрылі ўсе профсаюзы. Многа арыштаў.

У Валенсіі бастуючыя рабочыя электрастанцыі і газавага завода зрабілі пашкоджанні на гэтых прадпрыемствах з мэтай не дапусціць іх к пуску пры дапамозе інжынерных часцей арміі і флота. Губернатар падаў у адстаўку, матывуючы немагчымасцю аднавіць работу муніцыпальных прадпрыемстваў.

З'ЕЗД КОМПАРТЫІ ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 6 красавіка. (БЕЛТА).

На з'ездзе компартыі ЗША ў Кліўлендзе з дакладам ад імя компартыі выступіў **БРОУДЭР.**

— К VII з'езду ў 1930 г. компартыя ЗША налічвала 7.500 членаў. Зараз — 24.500. Лік фабрычна-заводскіх ячэек узрос са 100 да 338. Партыя павінна павялічыць колькасць сваіх членаў, узмацніць работу ў профсаюзах, прымыкаючых да амерыканскай федэрацыі працы або стаяць па-за апошнімі.

Выкрыўшы тактыку згоднікаў, Броудэр адзначыў неабходнасць стварыць найшырэйшы адзіны фронт.

ПАЖАРЫ Ў ЯПОНІІ

ТОКІО, 6 красавіка. (БЕЛТА).

Ва ўпалеўшай пасля пажара частцы Хакодаце новым пажарам поўнасцю знішчана 30 дамоў, часткова—10. Узрывам газадінавага танка забіта двое, ранена, 15, з іх 5 смяротна.

АСВЕТА Ў „ТРЭЦЯЙ ІМПЕРЫІ“

БЕРЛІН, 6 красавіка. (БЕЛТА).

«Дойчэ альгемейнэ цэйтунг» змяшчае артыкул, у якім прыводзіць даныя аб надзвычай моцным памяншэнні колькасці студэнтаў, прынятых у вышэйшыя школы ў апошнія гады. У 1933 г. у параўнанні з 1931 г. лік студэнтаў, прынятых у вышэйшыя школы, зменшыўся на 9 тыс. чалавек.

Калі ў 1931 г. 55 проц. скончыў шых сярэднія школы, паступілі ў ВНУ, то ў 1933 г. гэты процант знізіўся да 31. Процант залічаных у вышэйшыя школы жанчын у 1933 г. упаў да 22.

На летні семестр 1934 г. спецыяльнымі ўрадавымі мерапрыемствамі лічба новаступаючых у ВНУ абмежавана 15 тысячамі чалавек, з якіх 10 проц. жанчын. Газета, аднак, лічыць, што гэты кантынгент вельмі высокі і што неабходна далейшае зніжэнне гэтых лічбаў.

АЎСТРА-ВЕНГРА-ІТАЛЬЯНСКІЯ ПЕРАГАВОРЫ

ВЕНА, 6 красавіка. (БЕЛТА).

Аўстрыйскі і венгерскі друк падрабязна каментуе пачатыя сёння ў Рыме перагаворы аб гаспадарчым пагадненні паміж Аўстрыяй, Венгрыяй і Італіяй. Газеты змяшчаюць пералік патрабаванняў, якія прад'яўляюць адно другому гаспадарчыя колы дзяржаў, прымаючых удзел у перагаворах. Друк сведчыць аб наяўнасці сур'ёзных эканамічных супярэчнасцяй паміж інтарэсамі Аўстрыі, Венгрыі і Італіі.

СЕСІЯ АКАДЭМІІ НАВУК

У гутарцы з нашым супрацоўнікам аб красавіцкай сесіі БелАН прэзідэнт Акадэміі Навук тав. **Горын** паведаміў наступнае:

Сесія Акадэміі Навук адкрываецца 10 красавіка. Яна прысвечана выключна пытанням торфу. Думаю, няма неабходнасці падрабязна гаварыць аб вялікім значэнні гэтай сесіі.

Вядома, з якой увагай Ленін адносіўся да пытанняў торфу. Апублікаваныя ў ленінскіх зборніках пісьмы Леніна аб торфе маюць выключнае значэнне: у іх дан прагноз далейшага скарыстання торфу, як каштоўнейшага прадукта нашай гаспадаркі.

Перспектывы скарыстання торфу сапраўды велізарны. Торф можа быць выкарыстан у выглядзе апалу. Торф — добры сродак для ўгнаення нашых палёў. Торф таксама незамянімы сродак у жывёлагадоўлі. З торфу шляхам хімічнай апрацоўкі можна атрымаць цэлы рад каштоўнейшых прадуктаў. Усебаковай распрацоўцы пытанняў скарыстання торфу і прысвечана красавіцкая сесія Акадэміі Навук Беларусі. Вядома, якую вялікую ўвагу аддаў XVII партыйны з'езд пытанням эксплаатацыі і скарыстання торфу. Дырэктывы XVII партыйнага з'езда ляглі ў аснову нашай работы.

На сесіі Акадэміі будзе заслухана да 40 дакладаў выдатнейшых спецыялістаў.

Асноўныя работы сесіі будуць працякаць у трох секцыях: 1) Секцыі механізацыі здабычы, механічнай пераапрацоўкі і спальвання торфу, 2) секцыі тэрмічнай і хімічнай пераапрацоўкі торфу, 3) секцыі прымянення торфу ў сельскай гаспадарцы.

Тое, што на сесіі мы ўбачым буйнейшых прадстаўнікоў СССР, працуючых у галіне торфу прыдае ёй аграмаднае значэнне. Па сутнасці справы, красавіцкая сесія БелАН ператвараецца ў першы з'езд навуковых работнікаў Саюза, працуючых над пытаннямі торфу. На сесіі будуць даложаны апошнія дасягненні навуковых установаў Совецкага Саюза.

У заключэнне я хацеў-бы адзначыць, што навуковыя работнікі-тарфанікі Масквы, Ленінграда, Харкава, Свердлоўска і інш. гарадоў горача адгукнуліся на наша запрашэнне прыняць удзел у красавіцкай сесіі БелАН. Гэта зусім зразумела, бо навуковая грамадскасць Совецкага Саюза мае права патрабаваць ад нас — работнікаў Беларусі добра пастаўленай навуковай работы ў галіне торфу.

Наша сесія ў гэтым сэнсе павінна паслужыць магутным стымулам для далейшага магутнага разгортвання ў Беларусі навуковай работы ў галіне торфу. Існуючы ў Акадэміі Інстытут торфу, абагаціўшыся апошнімі навуковымі дасягненнямі, павінен будзе пасля сесіі ў самым бліжэйшым будучым ператварыцца ў магутны навуковы цэнтр ўсесаюзнага значэння.

***

Сесія адкрываецца ўступнай прамовай прэзідэнта Акадэміі Навук акадэміка **ГОРЫНА.** На пленуме сесіі будуць заслуханы даклады дырэктара інстытута торфу БелАН праф. **БАЦХЕЕВА**—«Значэнне торфу ў народнай гаспадарцы БССР», праф. **ЛЕПІНА**—«Сучасная становішча вывучэння тарфянога фонда СССР і БССР», а таксама паведамленні Галоўторфа, Укрторфа і Усесаюзнага інстытута торфу.

Удзел у сесіі буйнейшых спецыялістаў па торфу з усяго Совецкага Саюза прыдае сесіі БелАН саюзнае значэнне. У сувязі з гэтым прэзідыум БелАН пастанавіў выдаць працы сесіі на рускай і беларускай мовах.

АБ ШЭФСКАЙ РАБОЦЕ

Пастанова бюро Менскага гаркома КП(б)Б

1. Праведзеная гарадская шэфская канферэнцыя паказала значнае паслабленне шэфскай работы, што тлумачыцца адсутнасцю сістэматычнага кіраўніцтва шэфработай з боку парткомаў, комуністаў і ФЗМК, бяздзейнасцю і горшэфсовета, і большасці шэфскіх кустоў.

2. Ухваліць ініцыятыву раду прад прыемстваў (завод імя Варашылава, друкарня імя Сталіна, хлебакамбінат і інш.) аб уключэнні ва ўсесаюзнае спаборніцтва на лепшую пастаноўку шэфскай работы ў адказ на выклік харкаўскага завода «Серп и молот».

Прапанаваць усім парткомам, парт оргам да 3-га красавіка абмеркаваць на цэхавых і заводскіх сходах адозву завода «Серп и молот», увязваючы гэта з праверкай шэфскай работы прадпрыемства і ўстановы і распрацоўкай канкрэтных мерапрыемстваў, і абавязацельстваў па шэфскай рабоце.

3. Зацвердзіць рашэнне гарадской шэфскай канферэнцыі аб перабудове шэфскай работы з тым, каб арганізаваць шэфства цэхаў і брыгад непасрэдна над калгасамі і брыгадамі з перанясеннем цэнтру цяжару шэфскай работы непасрэдна ў брыгаду.

4. Ухваліць ініцыятыву горшэфскай канферэнцыі аб пасылцы непасрэдна ў брыгады 150 арганізатараў з лепшых ударнікаў, рабочых партыйцаў, комсамольцаў і актывістаў-беспартыйных.

Прапанаваць усім прадпрыемствам не пазней 29 сакавіка закончыць адбор і спісы намечаных да пасылкі з адпаведнай характарыстыкай прадставіць на зацвярджэнне гаркома.

Даручыць горшэфбюро для ўсіх гэтых таварышоў правесці аднадзённыя курсы-нарады.

5. Прыняць да ведама заяву горшэфбюро — т. Турэцкага, што згодна рашэння гарадской шэфканферэнцыі:

а) у калгасы будуць накіраваны 35 аграномаў, планавікоў і бухгалтараў для дапамогі ў складанні вытворча-фінансавых планаў;

б) будуць арганізаваны 2 перасоўныя рамонтныя брыгады для 1-й і 2-й МТС;

в) па лініі горадрава на час пасеўнай кампаніі будуць забяспечаны ўсе сельсоветы і буйнейшыя калгасы дактарамі-спецыялістамі і работнікамі для дзіцячых асляй;

г) па лініі «Чырвонага крыжа» і промкаапераціі будуць арганізаваны 4 пастаянных і 10 перасоўных цырульняў.

6. Абавязаць горшэфбюро на аснове матэрыялаў гарадской шэфскай канферэнцыі і вопыту перадавых прадпрыемстваў распрацаваць канкрэтны каляндарны план па ажыццяўленню шэфскай работы.

7. На бліжэйшым пасяджэнні бюро ГК заслухаць паведамленне двухтрох парткомаў аб становішчы шэфскай работы.

8. Бюро гаркома звяртае ўвагу ўсіх партарганізацый і шэфкустоў на тое, што, апрача аказання матэрыяльна-вытворчай дапамогі падшэфным калгасам, асабліва шэфская работа павінна забяспечыць сапраўдны пролетарскі ўплыў у справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў, узорнага правядзення веснавой сяўбы, выканання прынятых Менскім раёнам сацабавязацельстваў і забяспечыць практычнае правядзенне рашэнняў XVII з'езда партыі і гістарычных указанняў тав. Сталіна.

Сакратар Менскага гаркома КП(б)Б
РЫСКІН.

НА КАНФЕРЭНЦЫІ ДВОРНІКАЎ

Учора ў Доме партактыва адбылася незвычайная канферэнцыя. 450 дворнікаў сабраліся на ініцыятыве Менскага гаркома партыі для таго, каб абгаварыць пытанне, якім шляхам дабіцца хутчэйшага ператварэння Менска ва ўзорную сталіцу БССР.

У прэзідыуме — бюро гаркома і лепшая дворніца Менска тав. Качаніха з жакта № 41.

Першае слова было прадастаўлена тав. Качаніхе. Яна — адна з лепшых дворніц-ударніц. За тры гады работы прэміравана 8 раз.

Тав. Качаніха — сапраўдны гаспадар. Яна сочыць за тым, каб было чыста не толькі на дварах, на вуліцах, але і ў кватэрах жыхароў. Па яе ініцыятыве злосныя зрыўшчыкі санмінімума аддаюцца таварыскаму суду.

Затым выступілі дворнікі т.т. Казёлкіна, Рудзенка, Зеньковіч, Курылюк, Міхалёнак і інш.

Яны адзначалі, што многае залежыць ад саміх дворнікаў і загадчыкаў дамамі, ад іх жадання чэсна працаваць.

Што мы цяпер маем у Менску? Санітарнае становішча горада ўсё яшчэ не на вышні. Адозва гаркома партыі не надхоплена. Можна налічыць не менш 10-15 жактаў, якія яшчэ не ўзяліся сур'ёзна за санітарную ачыстку, за вывазку смецця і граязі, за прывядзенне ў парадак домаўладанняў. У гэтым пераканаліся т.т. Рыскін, Жуковіч, Хадасевіч, якія асабіста азнаёміліся са становішчам вуліц, двароў і домаўладанняў.

У першую чаргу тут вінаваты Горжылсаюз, Камгас, Санітарная станцыя, загадчыкі дамамі, якія ва многіх выпадках напляваціцельскі, па бюракратычнаму адносяцца да такога важнага пытання, як правядзенне санмінімума. Гэта-ж не анекдот, калі для таго каб ачысціць двор, дзе жыве сам намеснік старшыні Горжылсаюза тав. Трускін, патрабавалася 3 тыс. руб.

Тав. Дзеніцкі, намеснік начальніка Галоўміліцыі, падкрэсліў велізарнае значэнне, якое партыя і ўрад аддаюць пытанням быту, культуры і аздараўлення гарадоў.

Пасля заключнага слова тав. Хадасевіча канферэнцыя закрылася.

М. К.

ГАНДАЛЬ КУЛЬТТАВАРАМІ

Уся сетка райкультмагаў і кіёскаў у клапгасах, соўгасах, МТС і раённых цэнтрах, якая знаходзілася ў веданні райспажыўсаюзаў, перадана БАКТу.

Для павышэння тэхнічных ведаў работнікаў кнігарняў БАКТ адкрывае курсы на 40 чал. Адпушчана 75 тыс. руб. для абсталявання магазінаў у раёнах.

АЛІМПІЯДА МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ Ў ЖЛОБІНЕ

ЖЛОБІН, 7. (Па тэлефону ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Першыя два дні жлобінскай чыгуначнай алімпіяды мастацкай рабочай самадзейнасці — 5 і 6 красавіка — паказалі велізарнейшы размах самадзейнага руху сярод ударнікаў-чыгуначнікаў. Асабліва выдзяляецца работа магілеўскай агітбрыгады і вакальнага ансамбля. Магілеўцы паказалі актуальны па тэматыцы літаратурна-музычны мантаж абароны СССР, які мастацтвам прапагандуе задачы абароны краіны, скарыстоўваючы выступленні правадыроў партыі на XVII з'ездзе Музыка мантажа складзена з твораў совецкіх кампазітараў Шастаковіча, Каваля і Давідзенка.

На алімпіядзе прадэманстраваны велізарнейшыя дасягненні рабочых самадзейных гурткоў у галіне фізкультуры, рытму, пластыкі і фізкультурнага танца. Асаблівыя дасягненні ў гэтай галіне мае жлобінская жаночая фізкультурная група. Духавы аркестр асіпавіцкага, магілеўскага і жлобінскага пуліоў выхаваў новых здольных музыкантаў з радоў рабочых-ударнікаў.

Алімпіяда выявіла налічнасць талантлівых спевакоў з вялікімі вакальнымі данымі. Сюды адносяцца работніца магілеўскага вузла Чарвінская, якая прадэманстравала лірыка-драматычнае сапрано выключнай свежасці, мяккасці тэмбра і значнага дыяпазона.

Тав. Глазараў, рабочы чыгуначнага вузла, прадэманстраваў выключнай сілы і свежасці лірыка-драматычны тэнар. Тав. Лазарава, работніца Жлобіна, — лірычнае сапрано.

Сцэнічныя здольнасці выявілі гурткоўцы магілеўскай агітбрыгады тт. Шэўчык, Кудраўцева, Малевіч, Ходар і іншыя. Культурны танец паказалі жлобінскія трамваўцы.

Буйнейшым недахопам самадзейнага мастацтва раёна з'яўляецца кепскі падбор рэпертуара. Мала скарыстоўваецца мясцовы злобаднеўны матэрыял у рабоце агітбрыгады. Гурткі ў пераважнай большасці не забяспечаны кваліфікаванымі кіраўнікамі.

Неабходна адзначыць ініцыятыву пісьменнікаў і кампазітараў, якія прымаюць удзел у алімпіядзе ў якасці гасцей. Гэтыя таварышы склалі спецыяльную песню, прысвечаную комсамольцам-ударнікам Жлобінскага раёна, якая была тут-жа разучана і выканана ўдзельнікамі алімпіяды.

БДТ-1 і секцыя кампазітараў узялі шэфства над асобнымі самадзейнымі гурткамі раёна.

На алімпіядзе ўвесь час прысутнічае і прымае актыўны ўдзел у абгаварэнні яе работы начальнік палітаддзела жлобінскага чыгуначнага раёна тав. Балцін.

Учора, пасля выступлення бабруйскага драматычнага гуртка з пастаноўкай «Гроза», Астроўскага, алімпіяда закончылася.

МОДЭЛЬ.

ПАЛЬМЫ У ЦЭХАХ

Менскі трэст зялёнага будаўніцтва ў сакавіку азеляніў трэці паверх кандзітэрскай фабрыкі «Комунарка»: пасаджаны 60 пальмаў і драцэн. Бу дзе праведзена таксама азеляненне мяккага і карамельнага цэхаў. На дварэ фабрыкі будзе новы бульвар. Фабрычныя арганізацыі адпусцілі на азеляненне фабрыкі 5 тыс. руб.

На заводах «Комунар» і імя Варашылава будуць зроблены палісадники з клумбамі кветак. Газоны і кветнікі будуць рассаджаны ўздоўж галоўнага корпуса завода імя Варашылава. У плане работы ўключана азеляненне завода «Большэвік» і галантарэйнай фабрыкі імя Фрунзе, наборнага цэха шчотачнай фабрыкі імя Крупскай і двух цэхаў на абуткоўнай фабрыцы імя Кагановіча.

Некалькі бульвараў рабіваюцца каля інтэрнатаў дрэваапрацоўчага завода імя Молатава.

АФІЦЫЯЛЬНАЯ ТАБЛІЦА

выйгрышаў 3-га разрада 5-й усесаюзнай АЗЕТ-латарэі

тыраж якой адбыўся ў г. Гомелі 23-24 сакавіка 1934 года.

№№ латар білетаў	№№ серый	Кошт выйгрышаў у рублях	№№ латар. білетаў	№№ серый	Кошт выйгрышаў у рублях	№№ латар. білетаў	№№ серый	Кошт выйгрышаў у рублях	№№ латар. білетаў	№№ серый	Кошт выйгрышаў у рублях
00011	1—25	25	05215	25	200	11104	1—25	25	16025	1—25	25
00206	1—25	25	05385	1—25	25	11395	12	25	16055	1—25	25
00693	1—25	25	05416	09	200	11422	15	200	16207	1—25	25
00781	1—25	25	05458	1—25	25	11508	1—25	25	16617	20	1000
00798	1—25	25	05573	1—25	25	11872	1—25	25	16668	1—25	25
00953	1—25	25	05807	1—25	25	12146	1—25	50	17137	1—25	25
00977	1—25	25	06049	1—25	25	12197	1—25	50	17185	1—25	25
01665	1—25	50	06143	1—25	25	12992	1—25	25	17323	1—25	25
01962	20	200	06266	1—25	25	12996	1—25	100	17342	1—25	25
02323	1—25	25	06297	1—25	25	13019	10	200	17476	21	25
02449	1—25	25	06332	19	200	13038	04	200	17511	1—25	25
02557	15	200	06832	20	25	13050	15	200	17524	1—25	25
02614	1—25	25	07307	24	25	13101	1—25	25	17536	02	1000
02904	11	200	07379	1—25	50	13166	1—25	25	17911	1—25	100
02960	08	5000	07732	23	200	13280	17	200	17956	1—25	25
03124	23	500	07736	1—25	25	13580	11	200	18062	25	200
03128	20	200	08053	12	500	13600	1—25	100	18075	1—25	25
03367	1—25	50	08120	1—25	25	13955	1—25	25	18116	23	200
03531	05	25	08155	17	500	14168	24	25	18151	1—25	25
03662	1—25	25	08296	15	500	14209	23	25	18281	1—25	25
03843	1—25	25	08655	25	25	14353	23	500	18398	09	2500
03844	03	200	08843	1—25	25	14437	1—25	50	18586	08	500
04076	23	500	08856	1—25	25	14500	02	200	18595	1—25	25
04097	1—25	25	08922	1—25	25	14603	1—25	25	18632	1—25	25
04131	23	500	08984	12	500	14914	06	25	18986	1—25	25
04261	1—25	25	09726	1—25	25	14949	1—25	100	19661	1—25	[illegible]
04268	08	25	10010	1—25	25	15257	1—25	25	19808	1—25	[illegible]
04792	21	200	10019	11	500						
05048	1—25	25	10573	15	200	15623	1—25	50	19871	1—25	25

Як карыстацца табліцай і парадак атрымання выйгрышаў.

№№ серый 1—25 абазначаюць, што даны нумар білета выйграў за ўсіх 25 серыях.

№№ серый (не 1—25) абазначаюць, што даны нумар білета выйграў толькі ў паказаных серыі. Усе-ж астатнія білеты паказанага нумара, але другіх серый, не выйгралі.

Гэта табліца выйгрышаў з'яўляецца афіцыяльным дакументам, на падставе якога выплачваюцца выйгрышы.

Па ўсіх выйгрышах прадстаўляецца выйграўшым права атрымаць любы прадмет, пералічаны на адваротнай старонцы білета па выйграшай групе, або адпаведную грашовую суму.

Грашовыя сумы па выйгрышах да 100 руб. уключна выплачваюцца па прадаўленню выйграўшых латарэйных білетаў любой дзяржпрацаўчелкасай на аснове нумара Галоўнага кіраўн. ГТСК і ГК за № 53 ад 7 студзеня 1933 г. При выйгрышах звыш 100 руб., у тых выпадках, калі выйграўшы жадае атрымаць выйгрыш грашыма, і ва ўсіх выпадках калі выйграўшы жадае атрымаць выйгрыш натурай, білеты накіроўваюцца у Цэнтральны Совет Азет (Масква, Нікольскае вуліца д. 10-2) адкрытым каштоўным пісьмом непасрэдна, або праз мясцовае аддзяленне Азет з указаннем дакладнага адраса для пераводу грошай, або для накіравання выйгрышу. Пры жаданні атрымаць выйгрыш натурай, выйграўшы павінен указаць, які іменна выйгрыш а выйграўшай групы ён хоча атрымаць. Пры адсутнасці такога ўказання, Цэнтральны Совет Азет высылае выйгрыш грашыма.

У астатнім умовы выплаты выйгрышаў указаны на адваротце кожнага латарэйнага білета.

Выплата выйгрышаў пачынаецца па атрымканні на месцах 3-х чарговых нумароў газеты «Звязда» і «Окцябр», якіе следуюць за тымі нумарамі газет, у якіх апублікавана гэта табліца, і праводзіцца на працягу 6-ці месяцаў з дня апублікавання гэтай афіцыяльнай таблицы.

Выйгрышы, не выстрабаваныя на працягу паказанага тэрміна, паступаюць у распараджэнне АЗЕТ.

Старшыня тыражнай камісіі (старшыня горсовета) КАРНАЧОЎ.
Нам. старшыні (Гарфа) МАЯНЦ.
Прадстаўнік Горпрофсовета ХАЛФІН
Сакратар тыражнай камісіі ГОЛЬЦБЛАТ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Менск, друкарня «Звязды».

Усяўц. Галоўлітбела № К—2566. 52531.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ Ад 7 красавіка ПРЭМ'ЕРА!
У ПЕРШЫЯ ДНІ ПЕРШЫЯ СЕАНСЫ СОВЕЦКАГА ТЭАТРА НА ЭКРАНЕ

Рэж. арт. рэсп.: М. ЛЕАНІДАЎ, М. КЛІМАЎ.
Асн. артыст рэспублікі: Н. РАДЗІН, К. ЗУБЛЎ, І. АРКАДЗІН, В. ПАПОЎ, В. ТАПАРКОЎ, М. РОЗЕНСАКЕН, О. БАСАЎ, І. ЗАЙЦАЎ.
Мастацтвачасць Межрабпом-фільм.
Рэжысёр Р. ПРАТАЗАНАЎ.
Рэдаграфія — Касьян ГАЛЕЙЗОЎСКІ
Артысты: Заслужаная ТАЦЯРСКАЯ, С. МАРТЫНСОН, М. ЖАРАЎ, А. КТОРАЎ, П. ГОЛАДЖЭЎ, С. КАМАЛЮЎ.
У гуковым фільме-камедыі
МАРЫЯНЕТКІ
ФАМЕ КАНЦЭРТЫ АРКЕСТРА.
Каса з 1 гадзіны дня.
Пачатак у 6. 7—30, 9—15 і 10—45.
Спазніўшыяся на сеанс не дапускаюцца.

Дом Партактыва імя Карла Маркса
праводзіць
ТЭАТРЫТЫЧНЫ ДНАДЗЕННІК
8 красавіка для завода „КАМУНАР“ і 9 красавіка для завода „ВАРАШЫЛАВА“
Пачатак у 7 гадзін вечара.
Уваход па запрашальных білетах.
Дом Партактыва.

БАБРУЙСКІ ГАРКАМІТЭТ УЗАЕМАДАПАМОГІ ЛІКВІДУЕЦЦА
Установы і прыватныя асобы, маючыя прэтэнзіі, павінны звярнуцца ў ліквідком пры Бабруйскім РВК для канчатковага разліку з імі да 15-4 34 г.
Пасля паказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі разглядацца не будуць.
ЛІКВІДКОМ.

Бабруйская школа ФЗВ
пры дрэваапрацоўчым камбінаце
абвяшчае НАБОР вучняў
Школа рыхтуе кваліфікаваных рабочых па механічнай апрацоўцы дрэва, лесапільнай і фанерной вытворчасці. Тэрмін навучання ад 6 месяцаў да 1 году. У школу прымаюцца дзеці рабочых, калгаснікаў, беднякоў, серадняковаў і служачых. Узрост паступаючых не менш 17 год. Адукацыя 5—6—7 груп. Першапачатковая стыпендыя 30 р. у мн., якая будзе ў далейшым павышацца ў залежнасці ад паспяховасці. Усе вучні забяспечваюцца інтэрнатам, пасцельнымі прыладамі, рабочай сталоўкай, пайком па нормам рабочых камбіната (1 спіс. 1 катэг.).
Прыём заяў да 10 красавіка 1934 г. За заявы прыймаюцца наступныя дакументы: спраўку аб нараджэнні, аб адукацыі, соцстановішчы бацькоў.
Адрас: г. Бабруйск, Дрэваапрацоўчы камбінат, школа ФЗВ. Дырэкцыя.

Усесаюзны дзяржаўны трэст па загатоўцы племжывёлы
„ПЛЕМЗАГОТТРЭСТ“ НКЗ СССР
арганізаваў у БССР міжраённыя аддзяленні:
Менскае (Разінская 110), Віцебскае (Ветэрынарная 32), Жлобінскае, якія правяраюць і купляюць партыямі і ў розніцу буйную рагатую жывёлу, племянную і малочна-прадуцыйную, свіней, авец, а таксама праводзяць кантрак тацыю цялят і куплю іх на ўзросце звыш 2-х месяцаў. Жывёла прадаецца ў першую чаргу МТФ, дзяржаўным і кааперацыйным арганізацыям, а таксама калгаснікам і асобным рабочым.
Жывёла да здачы пакупцу падвяргаецца абавязковай ветапрацоўцы; згодна па становы СНК БССР і Канвенцыёбюро, арганізацыі і прадпрыемствы павінны закупляць жывёлу толькі праз сістэму Племзаготтрэста.
Арганізацыі і ўстановы, якія хочуць купіць жывёлу, павінны да 15 красавіка заключыць умовы з адпаведнымі аддзяленнямі.
Просьба да калгасаў